ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА 3-ці КВАРТАЛ І 2-ое ПАЎГОДДЗЕ 2007 ГОДА. СПЯШАЙЦЕСЯ!

Падпіска-2007

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ПАЎГОДДЗЕ

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА 3-І КВАРТАЛ І ІІ ПАЎГОДДЗЕ 2007 ГОДА.
ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»
(у рублях, устаноўлены з 01.07.2007 г.)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	8200	24600	49200
63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	7850	23550	47100
63858 (ведамасны)	13000	39000	78000
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	11850	35550	71100

СПАДЗЯЁМСЯ НА ВАШУ ПАДТРЫМКУ,
паважаныя падпісчыкі і работнікі паштовай сувязі.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

28 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.
ЧАЦВЕР

№ 119 (25984)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Парламенцкі дзённік

ДАТЭРМІНОВАЯ ПРАФЕСІЙНАЯ ПЕНСІЯ — толькі тым, хто пакіне шкодную працу

На ўчарашнім пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу дэпутаты ўхвалілі ў першым чытанні праект Закона «Аб прафесійным пенсійным страхаванні».

Прадстаўляючы дакумент, міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір Патупчык адзначыў, што сёння датэрміновыя пенсіі «для работнікаў асобных прафесійных груп» фінансуюцца за кошт агульнай сістэмы пенсійнага страхавання. Прычым гэтым па такія пенсіі «прыходзіць усё больш работнікаў. За апошнія гады доля датэрміновых пенсій у ліку новых прызначэнняў павялічылася больш чым на чвэрць і наблізілася да 30 працэнтаў новых прызначэнняў. Адпаведна расце доля агульных пенсійных сродкаў на льготныя пенсіі».

Сітуацыя, якая склалася ў сферы прызначэння датэрміновых пенсій, на думку міністра, «у перспектыве можа прывесці да росту пенсійных расходаў, якія ўжо з'яўляюцца высокімі, альбо да зніжэння агульнага ўзроўню пенсій».

Прапанаваны на разгляд парламентарыяў законапраект прадугледжвае, «што адказнасць за магчымую раннюю страту працаздольнасці работніка з-за яго занятасці ў шкодных для здароўя ўмовах павінен несці канкрэтны працадаўца», і гэтая адказнасць не будзе «дзяліцца з усімі, як сёння». Адказнасць павінна быць «у выглядзе сплаты мэтавых узносаў на датэрміновыя пенсіі сваім работнікам». Функцыя страхоўшчыка па прафесійнаму пенсійнаму страхаванню павінна быць ускладзена на Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

«Памер датэрміновай прафесійнай пенсіі будзе вылічвацца зыходзячы з аб'ёму пенсійных зберажэнняў на карысць канкрэтнага работніка і перыяду яе атрымання да дасягнення агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту».

Паводле слоў Уладзіміра Патупчыка, адна з ключавых нормаў законапраекта, — прыпыненне выплаты датэрміновай пенсіі ў выпадку, калі работнік вырашыў застацца на шкоднай працы. Міністр адзначыў, што адным з абгрунтаванняў гэтай нормы з'яўляецца тое, што «пенсійная сістэма з'яўляецца сацыяльным інстытутам і не павінна прэміраваць за працяглую працу ў шкодных для здароўя ўмовах, што адбываецца сёння».

У выпадку, калі застрахаваны работнік аддасць перавагу шкоднай працы, а не датэрміноваму выхаду на пенсію, то «пасля дасягнення агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту са сродкаў прафесійнага пенсійнага страхавання будзе выплачвацца дадатковая пенсія да агульнапрацоўнай».

«У цэлым прапануецца дастаткова мяккі варыянт змены інстытута льготных пенсій. Многія краіны ва ўмовах старэння насельніцтва і чакаемага росту пенсійнага цяжару ў маштабе, які пагражае стабільнасці эканомікі, пайшлі па радыкальнаму шляху адмены льготных пенсій у прынцыпе. З пункту погляду працэсу старэння насельніцтва наша краіна — не выключэнне. Таму ўвядзенне больш рацыянальных падыходаў у пенсійным забеспячэнні неабходна. І яно не павінна адкладацца, пакуль яшчэ ёсць час і магчымасць зрабіць гэта не так радыкальна», — дадаў Уладзімір Патупчык.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ЎЗНАГАРОДЗІЎ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ

Прэзідэнт Беларусі сваім указам узнагародзіў ваеннаслужачых рэспублікі медалём «За бездакорную службу» I, II, III ступені.

За ўзорнае выкананне службовых абавязкаў медалём «За бездакорную службу» I ступені адзначаны падпалкоўнік Аляксандр Адзінцоў, падпалкоўнік Ігар Бараноўскі, падпалкоўнік Сяргей Баханкоў, падпалкоўнік унутранай службы Сяргей Белавусаў, падпалкоўнік Міхаіл Ботнікаў, палкоўнік Юрый Вараб'ёў, палкоўнік Уладзімір Зіноўеў, палкоўнік Аляксандр Івонін. Гэтай узнагароды таксама ўдастоены падпалкоўнік Ігар Капытка, палкоўнік Ігар Качаткоў, палкоўнік медыцынскай службы Аляксей Кашчук, падпалкоўнік Ігар Кіку, палкоўнік Канстанцін Кішкевіч, палкоўнік Пётр Кміт, палкоўнік Анатоль Навіцкі, палкоўнік Васіль Суравец, падпалкоўнік Канстанцін Шульган, палкоўнік Уладзімір Яскевіч.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РАСЦІ ВЯЛІКІМ, МАЛЫ!

Кожны год у Мінскім абласным раддоме нараджаецца 50—60 немаўлят вагой менш за 1,5 кг

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка г.п. Смілавічы Анастасія СЕРАДА з трохтыднёвым сынам Косцем.

...Калі Волечка з'явілася на свет, яна важыла менш за кілаграм. Тады, у сярэдзіне 90-х, немаўлят з такой вагой у нас яшчэ не выходжвалі. Дзяўчынка знаходзілася ў крайне цяжкім стане, некалькі тыдняў урачы Мінскага абласнога раддома змагаліся за яе жыццё і ніхто не ведаў, выжыве яна ці не. Бабуля Волечкі, даведзеная да адчаю безвыніковымі спробамі вывесці малечу на больш-менш нармальны ўзровень жыццядзейнасці, часам гаварыла ўрачам: вы зрабілі ўсё, што маглі, не мучайцеся, яна ўсё роўна не выжыве...

А мама дзяўчынкі сядзела побач з ёю начамі і днямі і... вязала спаднічку.

— Мы заходзім у палату, а яна вяжа — як быццам упэўнена, што гэта спаднічка малой спатрэбіцца, — расказвае ўрач педыятрычнага аддзялення для нованароджаных з неўралагічнай паталогіяй і неданошаных Мінскага абласнога раддома Марыя Некрашэвіч. — Мы і сказаць нічога не можам... Напэўна, гэта маміна вера Волечцы і дапамагла. Дзяўчынка выжыла, выкараскалася, вырасла. Цяпер яна выдатна вучыцца ў школе, валодае замежнымі мовамі. Родныя ёй не нарадуюцца...

(Заканчэнне на 3-й стар.)

АФІЦЫЙНЫ ІНТЭРНЭТ-ПАРТАЛ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ ЦЯПЕР ПРАДСТАЎЛЕНЫ І НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Аб гэтым **БЕЛТА** паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы. Цяпер матэрыялы, што з'яўляюцца на Інтэрнэт-партале, будуць публікавацца на трох мовах: дзвюх дзяржаўных — беларускай і рускай, а таксама на англійскай.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ВЫРАТАВАЎ ДВАІХ

У вёсцы Доўбнева Камянецкага раёна загарэўся дом, у якім жыў дзед з сынам.

Пажар убачыў А. Жогаль — 26-гадовы жыхар вёскі. Ён кінуўся ратаваць людзей. Старога ён знайшоў у спальні, а затым выцягнуў на вуліцу і сына гаспадара, які быў ужо ў непрытомнасці. З дзедам вялікіх праблем не было, а вось сын у цяжкім стане знаходзіцца ў бальніцы. Рашучыя дзеянні жывёлавода прыцягнулі ўвагу мясцовага аддзялення МНС. Хлопца чакае падзяка.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НА УБАРЦІ — НОВЫ МОСТ

27 чэрвеня ў Лельчыцкім раёне адбылося адкрыццё новага моста цераз раку Убарць на дарозе Тураў—Лельчыцы—Славечна—мяжа Украіны. Заказчыкам гэтай будоўлі з'яўляецца РУП «Гомельаўтадар», які і прафінансаваў яе ў 3,7 мільярда рублёў, а ўзводзілі аб'ект калектывы мостабудаўнічага ўпраўлення № 4 з Гомеля, упраўлення механізацыі № 58 з Мазыра і адкрытага акцыянернага таварыства «Палессебудпраект» (Лельчыцы). На адкрыцці гэтай будоўлі прысутнічалі старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Якабсон і намеснік міністра транспарту і камунікацый Анатоль Лыцін.

Мост павінен быў уступіць у эксплуатацыю ў верасні—кастрычніку, аднак будаўнікі зрабілі ўсё, каб скараціць гэтыя тэрміны. І зараз мост даўжынёй у 148 метраў ускінуўся над Убарцю. Першы, пасляваенны, як расказаў нам начальнік Лельчыцкага ДЭУ-42 Мікалай Дашкевіч, быў драўляны і ўзведзены ў 1953 годзе.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ШКОЛЬНІКАЎ ЗА ДАПАМОГУ МІЛІЦЫІ ЎЗНАГАРОДЗІЛІ МАБІЛЬНЫМІ ТЭЛЕФОНАМІ

Двое віцебскіх школьнікаў за раскрыццё крадзяжу атрымалі ва ўзнагароду па мабільнаму тэлефону, паведаміў начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама Леанід Фармагей.

Дэтэктыўная гісторыя адбылася ў адным з двароў Віцебска. Увагу 10-гадовага Сашы Мякішава і яго цёзкі 13-гадовага Сашы Белавусава прыцягнулі двое мужчын, якія абшуквалі кішэні свайго добра падвыпіўшага сабутэльніка. Яны запомнілі прыкметы злачынцаў, прасачылі, куды адзін з іх накіраваўся, і паведамілі ў інспекцыю па справах непаўналетніх. На працягу гадзіны дзякуючы хлопчыкам злачынцы былі затрыманы. У пацярпелага быў скрадзены мабільны тэлефон і грошы.

Як адзначыў Леанід Фармагей, учынак дзяцей — гэта сведчанне іх высокай прававой свядомасці, даверу да міліцыі і добрай работы інспектара па справах непаўналетніх гэтага мікрараёна. За работу па выхаванню даверу да праваахоўных органаў у сваіх падапечных інспектару будзе аб'яўлена падзяка. Пакуль пісьмо з падзякай міністра ўнутраных спраў Беларусі накіравана бацькам хлопчыкаў.

Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.

САЛА НЕ ДАЕХАЛА

Двое грамадзян Украіны спрабавалі падпольнымі дарогамі ўвезці на тэрыторыю Беларусі больш за 800 кілаграмаў сала.

Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржкамітэта пагранічных войскаў, кантрабандысты перавозілі нацыянальны ўкраінскі прадукт на двух гужавых павозках. Апроч сала памежнікі знайшлі яшчэ і каля 40 кілаграмаў памідораў і больш за 100 найменняў прамысловых тавараў. Агульны кошт кантрабанды складае больш за 40 мільёнаў рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

29 чэрвеня 2007 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца заключнае пасяджэнне сёмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Віншавальная паштоўка

З 60-годдзем шчыра віншуем начальніка Капыльскага вузла паштовай сувязі **В.А. РАЙЦКАГА**! Здароўя Вам, шаноўны Віктар Антонавіч, спору ды ладу ў працы, павагі і любові з боку родных і блізкіх!

Звяздоўцы.

Калі жыллё нельга абмяняць

Пытальнік

У сувязі з мяркуемым павелічэннем тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі вырашыла памяняць сваю трохпакаёвую кватэру на жыллё з меншай плошчай. Аднак калі я адшукала добры варыянт абмену, мне ў ім адмовілі, бо ў нашым доме сёлета запланавалі капітальны рамонт. У якіх выпадках па закону абмен жылымі памяшканнямі немагчымы?

Ганна МАЦІС, *г. Мінск.*

Як паведамілі рэдакцыі ў жыллёвым аддзеле Мінгарвыканкама, адпаведныя органы не даюць дазвол на абмен жылымі памяшканнямі, калі дом, у якім знаходзіцца такое памяшканне, з'яўляецца аварыйным, падлягае зносу або пераабсталяванню ў нежылы, пагражае абвалам, перадаецца для дзяржаўных патрэб і калі дом падлягае капітальнаму рамонту з перапланіроўкай мянавіта вызначанага на абмен жылога памяшкання.

Абмен забараняецца ў тым выпадку, калі наймальніку кватэры прад'яўлены іск аб скасаванні ці змяненні дагавора найму жылога памяшкання або аб прызнанні яго несапраўдным і калі ў дачыненні да члена арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў разглядаецца пытанне аб выключэнні яго з гэтай арганізацыі.

Нельга абменьвацца жылымі памяшканнямі, калі ў сувязі з абменам у кватэру, у якой пражываюць два і больш наймальнікі, усяляецца грамадзянін, які пакутуе цяжкай формай хранічнага захворвання, пры якім сумеснае пражыванне з ім у кватэры немагчыма.

Забараняецца таксама абмен жылымі памяшканнямі, калі ён мае карыслівы або фіктыўны характар, або калі на жылое памяшканне накладзены арышт або забарона адчужэння. Не падлягаюць абмену жылыя памяшканні, якія з'яўляюцца службовымі, знаходзяцца ў спецыяльным доме або адносяцца да жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

З-ЗА СПЯКОТЫ Ў ЕЎРОПЕ ЗАГІНУЛІ ДЗЕСЯТКІ ЛЮДЗЕЙ

Паводле апошніх паведамленняў, ад спякоты ў Паўднёвай Еўропе загінулі як мінімум 46 чалавек.

Найбольшая колькасць ахвяраў у Румыніі — 29 чалавек. Гэтымі днямі слупок тэрмометра там падымаўся да 45 градусаў па Цэльсію. Чацвёра чалавек загінулі ў Грэцыі (да 46 градусаў па Цэльсію), шасцёра — у Італіі, трое ў Албаніі і як мінімум чацвёра ў Босніі, Харватыі і Турцыі. На Сіцыліі памерлі трое старых.

У Балгарыі па рашэнню ўладаў паліваюць вадой трамвайныя рэльсы, каб пазбегнуць іх дэфармацыі. У сямі правінцыях Турцыі ўлады адпусцілі з работы частку служачых: цяжарных жанчын і хворых.

З-за ўзросшага спажывання піва ў Бельгіі нестае бутэлек, і асобныя кампаніі вымушаны прыпыніць вытворчасць пеннага напою як мінімум на тыдзень. Каб хоць неяк вырашыць сітуацыю, вытворцы піва заклікаюць бельгійцаў здаваць тару.

У той жа час Паўночную Еўропу заліваюць дажджы. Усяго за некалькі гадзін у Вялікабрытаніі ў асобных рэгіёнах за некалькі гадзін выпала месячная норма ападкаў. Загінулі тры чалавекі, у тым ліку 14-гадовы хлопчык.

ЮШЧАНКА ПЛАНУЕ «РАСЧЛЯНІЦЬ» РАДУ

Учора завяршыла сваю работу трэцяя сесія Вярхоўнай Рады Украіны V склікання. Закрываючы апошняе пасяджэнне парламента, спікер Яўген Марчук падзякаваў усім дэпутатам за плённую работу. Ён выказаў упэўненасць, што ў верасні ўдасца сабраць кворум, і выказаў спадзяванне, што ў кастрычніку ўдасца ўхваліць бюджэт на наступны год.

Аляксандр Мароз папрасіў дэпутатаў быць «вельмі пільнымі», паколькі, паводле яго слоў, на пазачарговых парламенцкіх выбарах рыхтуюцца масавыя фальсіфікацыі. Рада вернецца да працы 4 верасня.

Тым часам прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка мае намер вынесці на рэферэндум новую рэдакцыю канстытуцыі, у якой будзе прадугледжана двухпалатная сістэма парламента. Пра гэта паведаміў намеснік кіраўніка сакратарыята кіраўніка дзяржавы Ігар Пукшын. Паводле яго слоў, Украіна «саспела» для двухпалатнага парламента.

КАМІТЭТ КАНГРЭСА ЗША АДОБРЫЎ ЗАКОНАПРАЕКТ АБ ЗАБАРОНЕ ЯДЗЕРНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА З РАСІЯЙ

Камітэт па замежных справах Кангрэса ЗША адобрыў праект закона аб узмацненні санкцый у адносінах да Ірана і забароне на супрацоўніцтва з Расіяй у ядзернай сферы.

Законапраект прадугледжвае накладанне санкцый на нафтаздабываючыя кампаніі, якія супрацоўнічаюць з Іранам. Пад санкцыі павінны патрапіць такія гіганты, як Royal Dutch Shell, Norsk Hydro, і China's National Offshore Oil Corp, якія здабываюць нафту ў Іране і маюць шырокія камерцыйныя інтарэсы ў ЗША. У дакументе таксама падкрэслена, што «ніякае пагадненне аб супрацоўніцтве» ў ядзернай галіне паміж Расіяй і ЗША не можа быць падпісана, калі прэзідэнт ЗША не пацвердзіць кангрэсу, што Расія «спыніла ўсё ядзернае спрыянне Ірану».

ТОНІ БЛЭР УРУЧЫЎ КАРАЛЕВЕ ПРАШЭННЕ АБ АДСТАЎЦЫ

Брытанскі прэм'ер-міністр Тоні Блэр перадаў каралеве Елізавеце II прашэнне аб адстаўцы.

Гэта адбылося ў ходзе аўдыенцыі ў Букінгемскім палацы. Пасля гэтага каралева павінна выклікаць да сябе міністра фінансаў Гордана Браўна і даручыць яму сфарміраваць новы ўрад.

ПОЛЬСКІ ЧАСОПІС ВЫЙШАЎ З ГОЛАЙ МЕРКЕЛЬ НА ВОКЛАДЦЫ

Польска-нямецкі крызіс, які суправаджаў саміт ЕС, не дае палякам спакою: штотыднёвік Wprost выйшаў з правакацыйнай выявай «мачахі Еўропы», як гэта сцвярджае надпіс, што суправаджае фотамантаж.

На малюнку змешчана спадарыня канцлер з голымі грудзямі, да якіх прыпалі блізняты Качыньскія. Падзагаловак: «Немцы былі адвакатамі Польшчы, а цяпер сталі нашымі пракурорамі».

Як піша часопіс, непасрэдна перад сустрэчай у Бруселі нямецкія СМІ і палітыкі разгарнулі франтальнае наступленне на Польшчу. Іх мэтай было скампраметаваць палякаў і такім чынам пазбегнуць унясення ў парадак дня пытання аб сістэме галасавання.

ЦРУ АБЯЦАЛА ЗАБОЙЦАМ ФІДЭЛЯ КАСТРА $150 ТЫСЯЧ

Цэнтральнае разведвальнае ўпраўленне ЗША збіралася заплаціць 150 тысяч долараў забойцам кубінскага лідара.

Актыўная падрыхтоўка замаху на Кастра вялася амерыканскімі спецслужбамі ў 1960 годзе. Ліквідацыю камандантэ «заказалі» кіраўнікам амерыкана-кубінскай мафіі. Такая інфармацыя ўтрымліваецца ў дакументах ЦРУ, якія былі рассакрэчаны на гэтым тыдні.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.06.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 880,73
1 латвійскі лат	4 138,53
1 літоўскі літ	834,29
1 чэшская крона	100,50
1 польскі злоты	757,55
1 расійскі рубель	82,99
1 украінская грыўня	427,44

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	25,8468
10 UAH	51,2254
1000 BYR	12,0309
EUR	34,6993

Курс у гандлёвых кампаніях (на 27.06.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у радыяцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон радыяцыі: 209-69-01.

ISSN 1990 - 763X

СКАРБ З КОСМАСУ

шукаюць у Стаўбцоўскім раёне

Калі яго знойдуць, навуковы свет ускалыхне сенсацыя. У Стаўбцоўскім раёне прыступілі да пошукаў... метэарыта. Нягледзячы на сакрэты вакол назвы мясцовасці, нам удалося даведацца, дзе праходзяць раскопкі, — каля вёскі Хотава. Дарэчы, у сусветным каталогу зарэгістравана пяць беларускіх метэарытаў. Калі стаўбцоўская зямля падарыць яшчэ адзін, то з'явіцца шанц растлумачыць некаторыя гіпотэзы.

Мяркуюць, што касмічны госць, якога зараз настойліва пачалі шукаць, з'яўляецца часткай вядома Забродскага метэарыта. У 1893 годзе каля вёскі Забароддзе сяляне ўбачылі вялікую ўспышку, за якой адбылося падзенне нябеснага госця: ён прабіў дах і пакінуў след на сцяне хаты. Потым навукоўцы знайшлі гэты метэарыт, але не цалкам, а толькі пярэднюю частку вагой у тры з невялікім кілаграмы, яна нагадвала пярэднюю частку ракеты.

У 2001 годзе ў Інстытут геахіміі і геафізікі НАН патэлефанаваў мінчанін Гендрык Талейка і расказваў, што ведае, дзе ляжыць метэарыт.

— Спачатку мы не прынялі на веру яго словы, таму што такія выпадкі здараюцца даволі часта — да нас тэлефануюць людзі, прысылаюць на экспертызу пароды, якія нагадваюць па знешняму выгляду метэарыты, але імі не з'яўляюцца, — кажа Усевалад Бардон, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута, старшыня камісіі па метэарытах. — Аднак гэты суразмоўца быў такі настойлівы, што нам нічога не заставалася, як паехаць за ім у вёску Хотава. Там ён упэўнена паказаў месца, воранку ў зямлі, у якой, як расказала яму маці, ляжыць метэарыт. Паводле слоў Г. Талейкі, маці яго было гадоў дзесяць, калі ў вёсцы бачылі падзенне метэарыта. Мясцовыя жыхары, узрост якіх быў больш чым сталым, таксама пацвердзілі гісторыю аб тым, што ў гэтым месцы ляжыць нешта, што «ўпала з верху, і бляск ад яго быў такі, што на некаторы час у нябёсах стаялі два сонцы».

Пасля праведзенага аналізу вучоныя даведаліся, што воранка гэтая ўтварылася не на прычыне

прыроднай, а, хутчэй за ўсё, з-за знешняга ўмяшання. А потым, пасля правядзення замераў спецыяльным прыборам, магнітометрам, аказалася, што на глыбіні знаходзіцца вялікае цела, ад якога ідуць магнітныя хвалі — а гэта адна з асаблівасцяў менавіта метэарытаў. Такім чынам, сцвярджваецца расказ аб тым, што з неба ўпаў вялікі камень і ўтварыў вялізную яму.

— Тое, што ў зямлі Хотава ляжыць снарад часоў вайны, амаль выключана, — кажа Усевалад Бардон. — Па нашых даных, гэтая, пакуль невядомая рэч, якая ляжыць на глыбіні пяці—шасці метраў, больш шчыльная, чым навакольныя пароды. Пакуль распрацавана толькі два метры глебы, капаюць наколькі магчыма глыбока. Пошукі вядуць уфолагі, якія загарэліся ідэяй і згадзіліся правесці раскопкі, аднак працуюць яны толькі па выхадных. Дыяметр воранкі прыблізна 100—110 метраў. Таму справа рухаецца, але не вельмі хутка. Будзем чакаць...

Са здзіўленнем я даведаўся, што ў нашай краіне ёсць некалькі аматараў, якія маюць калекцыі метэарытаў. Не вельмі вялікія, але ўсё ж такі! Гэта для тых, хто захапляецца космасам і ўсім, што мае з ім сувязь. А для даследчыкаў метэарыт мае іншае значэнне.

— Трэба разумець, што метэарыт — гэта рэч незямногa паходжання. Яго вывучэнне дапамагае зразумець і растлумачыць гіпотэзы, загадкі, падштурхнуць да адкрыццяў. Калі наша Зямля, і метэарыты, як пароды незямнога паходжання, рэшткі іншых планет, падобныя па саставу слаёў і г.д., то, магчыма, усе планеты ўтвораны амаль аднолькава, — тлумачыць Усевалад Бардон. — Таксама метэарыты ўтрымліваюць і хімічныя элементы, якія ведаем мы, у іх няма невядомых для вучоных складовых. Гэта пацвярджае думку аб універсальнасці Сусвету. Былі знойдзены ў іх і арганічныя злучэнні, што дае падставу для меркавання, што не толькі на нашай планеце, але і ў іншых частках космасу ёсць жывыя арганізмы. Аднойчы быў знойдзены метэарыт, у складзе якога былі алмазы. Гэтая знаходка дапамагла ў распрацоўцы тэхналогіі па стварэнню штучных алмазаў.

Вельмі спадзяёмся, што на Стаўбцоўшчыне знойдуць метэарыт. Карысць будзе і даследчыкам, і энтузіястам-уфолагам, і простым рамантыкам. Згадзіцеся, не кожны дзень зорка, якая падае з неба, выкопваецца потым з зямлі.

Напрыканцы гутаркі Усевалад Бардон адказаў на некалькі пытанняў, накшталт «усё, што вы хацелі ведаць аб метэарытах, але не ведалі, дзе спытаць».

— Кажуць, што каштуюць метэарыты вельмі шмат...

— Ну... гэта ў залежнасці, якія яны. Напрыклад, дробная частка метэарыта, якую адкалолі ад адзінага вялікага вагой у трыста кілаграмаў, будзе, канешне, каштаваць менш, чым метэарыт, які лічыцца «рэдкім». У сярэднім кошт аднаго грама метэарыта параўноўваюць з коштам аднаго грама золата.

— Тады, Усевалад Яўгенавіч, цікавіць мяне наступнае пытанне. У сувенірных крамах, на выставах каштоўных камянёў, у ювелірных магазінах даводзілася трымаць рэчы, якія зроблены быццам бы з метэарыта. Не так даўно ў Маскве бачыў статуэтку вышынёй у два з паловай метры, якая зроблена, як запэўнівала прадавец, «з сапраўднага метэарыта». Як адрозніць падробку?

— Наконт статуэткі, я думаю, гэта падман. Тым больш, што прадавалася яна ў звычайнай сувенірнай лаўцы. У Маскве, канешне, багатыя людзі жывуць, аднак і ім будзе даволі дорага набыць вялікую статуэтку, зробленую з натуральнага метэарыта.

Калі вы ўбачыце метэарыт, ужо ніколі яго не пераблытаеце. Нават маленькі важыць адчувальна больш, чым проста камень такога ж памеру. Яго паверхня звычайна чорная, на першы погляд быццам бы пакрытая металам. І на ёй дасканала відаць увагнутасці, прыкладна такія, якія застаюцца на гліне, якую сціскалі пальцы ганчара.

— У фантастычных фільмах часта паказваюць ігганцкія метэарыты, якія падаюць на Зямлю і могуць знішчыць усё жывое. У рэальнасці існуе такая пагроза?

— Так, нельга выключаць верагоднасць, што метэарыт можа ўпасці на нашу планету і нанесці ёй шкоду. Але, наколькі я ведаю, сучасныя сістэмы, якія назіраюць за небам і космасам, у тым ліку і ваенна-паветраныя, у стане своечасова разглядзець і адвесці пагрозу. У любым выпадку, гэта справа вырашаецца толькі аб'яднаннем рэсурсаў некалькіх дзяржаў — у адзіночку не справіцца, трэба шмат фінансавых рэсурсаў. Пры гэтым, што датычацца фільмаў, то большасць з таго, што паказваюць, застаецца фантастыкай.

— У людзей ёсць меркаванні, што метэарыты маюць магічныя ўласцівасці? Або кажуць, што яны радыеактыўныя...

— Метэарыты не ўтрымліваюць радыяцыю, гэта даўно даказалі. Як вучоны я сцвярджаю, што ніякіх звышнатуральных уласцівасцяў яны не маюць. Аднак, калі разглядаць усе версіі, то і сапраўды, некаторыя людзі вераць у тое, што метэарыты дапамогуць ім. Напрыклад, пры знаходжанні метэарыта, які ўтрымліваў алмазы, адзін яго кавалак трапіў у рукі вучоных, а другі мясцовыя жыхары растаўклі ў пыл і... з'елі. Яны лічылі, што такім чынам выратуюцца ад усіх хвароб. Пасярод знакамітага мусульманскага храма Кааба ляжыць вялізны свяшчэнны камень, які мясцовыя святары называюць метэарытам. Аднак даследчыкаў, каб высветліць, ці так гэта, да яго не пускаюць.

— Якія віды метэарытаў існуюць?

— Яны падраздзяляюцца на тры класы па складу — каменныя, жалезныя і жалезна-каменныя. Найбольш распаўсюджаны першы клас, прыблізна 95 працэнтаў ад усіх знойдзеных. У суткі ў розныя поры года падае ад 1000 да 10000 тон метэарытнага рэчыва. Большая частка з іх згарае. А тыя, што трапілі на нашу планету, падаюць звычайна ў цяжкадаступныя месцы.

— Што робяць з метэарытамі, пасля таго як іх знаходзяць?

— Іх даследуюць, рэгіструюць у каталогу, які ўяўляе адзіны рэестр усіх метэарытаў на нашай планеце, з апісаннем — клас, вага, назва, знешні выгляд. Беларускія метэарыты, якія знаходзілі ў савецкія часы, рэгістравалі праз расійскі бок. Потым яны трапляюць у даследчыя інстытуты, музеі. Часам распілоўваюцца на кавалкі, якімі потым абменьваюцца з замежнымі лабараторыямі. У музеі пры нашым Інстытуце ёсць 76 кавалкаў метэарытаў, якія мы атрымалі з розных краін.

Дзмітрый АЛЬФЕР.
Фота аўтара.

Звязда–90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося **42 дні**

РАБІЦЕ ГАЗЕТУ ЯШЧЭ БОЛЬШ ЦІКАВАЙ!

Фота БЕЛТА.

Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Валерый СЯЛІЦКІ газету «Звязда» чытае ўжо, бадай, тры дзесяцігоддзі і ў гутарцы з нашым уласным карэспандэнтам падкрэсліў, што з таго часу не прапусціў ніводнага нумара.

— Газета вызначаецца ўдумлівым падыходам да праблем нашага грамадства, — сказаў ён, — яна не кідаецца ў крайнасці, шмат увагі ўдзяляе беларускай спецыфіцы, нацыянальнай культуры, заклікае не забываць родную мову, за што калектыву журналістаў удзячныя многія. Мне падабаецца, што газета першай сярод рэспубліканскіх выданняў звярнулася да тэмы работы Саветаў дэпутатаў і на добрым узроўні асвятляе вопыт іх і праблемы, выпускаючы кожны тыдзень укладку «Мясцовае самакіраванне».

Хачу пажадаць старэйшаму калектыву «Звязды» больш востра ставіць маладзёжныя праблемы хоць бы па той прычыне, што грамадства занепакоена лёсам моладзі, і маюцца такія праблемы, якія як бы «выслізваюць» ад улады і прэсы ў тым сэнсе, што некаторая частка юнакоў і дзяўчат паводзіць сябе не вельмі добра. Трэба, на мой погляд, удзяляць больш увагі ў гэтым кантэксце і становішчу спраў, якія склаліся ў так званай жаночай супольнасці, каб нашы прыгожыя беларускі вялі сябе дастойна, каб на першым плане ў іх быў клопат аб стварэнні сям'і.

Хацелася б, каб газета працягвала барацьбу з экалагічнымі парушэннямі, не дапускала, каб з парадку дня знікала актуальнасць чарнобыльскіх спраў. Лічу, што ў нас ёсць хібы ў выхаванні «мужчынскай палавіны». Паглядзіце, у адукацыі і культуры склалася такое становішча, што там назіраецца перавага кіраўнікоў-жанчын і, на мой погляд, хлопцы як бы «выкінуты» там на другі план. Маленькія падлеткі вельмі дапытлівыя, яны стараюцца ўнікнуць у многія цікавыя справы і, мяркую, прымушаць іх займацца вышыванням ці нечым іншым, жаночым, не зусім правільна. Трэба рабіць акцэнт на тэхнічную творчасць юнакоў, нацэльваць на культуру здароўя, спорту, на іншыя чыста мужчынскія заняткі, якія б фарміравалі ў іх характар сапраўдных мужчын, бацькоў будучых сем'яў, абаронцаў нацыі і дзяржавы ў цэлым.

Я паважаю «Звязду». З ёй хочацца трымаць кантакт, чытаць яе. Так трымаць, звяздоўцы! Рабіце газету яшчэ больш цікавай, настойлівай у асвятленні жыццёвых праблем нашай роднай Беларусі.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ДАВЕР НЕ ГАРАНТУЕ

У сваім лісце пенсіянер з Баранавіч Мікалай К. паскардзіўся ў «Звязду», што доўгі час не можа прайсці абследаванне ў цэнтральнай паліклініцы горада. На дактароў наракаюць многія, але, як правіла, робяць гэта ў вуснай форме, а тут чалавек напісаў.

Са скаргай давялося зайсці да намесніка галоўнага ўрача паліклінікі, і праблему можна было лічыць закрытай. Высветлілася, што цяганіна ўзнікла па аб'ектыўнай прычыне, бо паліклініка абслугоўвае людзей удвая больш, чым разлічана, хоць разам з гэтым былі і суб'ектыўныя абставіны, звязаныя з урачамі.

Адным словам, пісаць артыкул на той час не было нагоды, а тут адкрыліся факты, якія сведчаць, што і хворыя часта заблытваюць сітуацыю і давяраюць сваё здароўе выпадковым людзям. І не важна, што тыя ў белых халатах.

Не толькі Мікалай К. мае цэлы «букет» розных хвароб, захварэла і яго жонка. У Вольгі ўжо з год, як узніклі праблемы з нагой. Жанчына не можа хадзіць, а дактары да гэтага часу не могуць выявіць прычыну хваробы.

Не могуць у Баранавічах? Але, найперш, неабходна легчы на ўсебаковае абследаванне ў бальніцу. І хоць трапіць туды цяжкавата, тым не менеі пасля ўмяшання ў сітуацыю нашай газеты ўсё спрасцілася. Ва ўсякім разе пра гэта па тэлефоне сказалі пенсіянеры.

Пакуль не пастаўлены дакладны дыягназ, пра лячэнне гаворка не можа ісці, але чалавек шукае выйсце і часта спадзяецца на выпадак — ідзе лячыцца да прыватніка, якога параіў нехта са знаёмых. Вось і пайшоў аўтар ліста са сваёй жонкай да доктара, які практыкуе мануальную тэрапію. Жанчыне тыя сеансы шкоды не зрабілі. Інтэнсіўны масаж нават прынёс палёгку, а вось у яе мужа пасля таго, як доктар яго «памясіў», адкрылася грыжа. Чалавек за свае ж грошы нажыў сабе яшчэ адну праблему. Дактары, улічваючы агульны стан здароўя і спякотнае надвор'е, з аперацыяй цягнуць.

А жанчына працягвае лячыцца па «наводцы». Параілі ёй паехаць у Мінск і паказаць нагу прафесару, які, быццам бы, ужо дапамог не аднаму хворам. Той прафесар працуе ў дзяржаўнай установе і яшчэ практыкуе ў прыватным «цэнтры».

Доктар пагартаў медыцынскую карту хворай, паглядзеў на здымак пазваночніка, паразважаў і зрабіў укол. Жанчына заплаціла грошы і паехала дамоў. Ад лячэння ў прафесара хворай лягчэй не стала. І тут насцярожвае адзін момант.

Вось хворага абследаваў урач, прыйшоў да нейкай высновы і назначыў лячэнне. Напэўна, усё гэта павінна быць запісана ў медыцынскую карту хворага, каб калегі ведалі, якое прымянялася лякарства. Сталічны прафесар нічога запісу ў карце не пакінуў, які ўкол зрабіў і ад чаго — невядома. І цяпер нават даказаць, што ўрач жанчыну лячыў, немагчыма.

Сёння вельмі многія ўрачы працуюць не толькі ў дзяржаўных медыцынскіх установах, але і прыватных. І калі нехта думае, што ў апошніх працуюць дактары больш высокай кваліфікацыі, то моцна памыляюцца. Яшчэ існуе вера, што за грошы можна атрымаць сапраўднае лячэнне. Гэта — самападман. Прыстойны і таленавіты ўрач застанецца такім, дзе б ён ні працаваў.

Сярод медыкаў, як і сярод спецыялістаў іншых прафесій, ёсць людзі таленавітыя і высокапрафесійныя. Але ж талент з'ява рэдкая, а хвораму хочацца бачыць у кожным доктару цудатворца. А калі нехта парэкамендуе ўрача, то ўзнікае надзея, што менавіта ён дапаможа. На жаль, даволі часта пасля наведвання такога доктара ў хворага наступае расчараванне, бо ён чакаў цуду.

А зараз вернемся да пенсіянераў, якія пацікавіліся, ці можа «Звязда» яшчэ зрабіць для іх нейкія захады: дапамагчы, паспрыяць, параіць.

Можа. Трэба не давяраць выпадковым парадам і не хадзіць па розных урачах-прыватніках, гэта, па-першае, а, па-другое, неабходна прайсці поўнае абследаванне ў Баранавічах. Няхай дактары паставяць дыягназ. Калі ў гарадзе не здолеюць дапамагчы ці не ўстановяць прычыну захворвання, то трэба прасіць, каб накіравалі ў вобласць ці Мінск. Дарэчы, у сталіцы не супраць рыняць хворую, але для гэта неабходна мець накіраванне з Баранавіч.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Касі, сям'я, пакуль раса...

Учора позна вечарам завяршыўся чарговы этап сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар вёскі», што з красавіка праводзіцца ў Глыбоцкім раёне. Па гэтай прычыне, на жаль, мы не можам назваць сямейную пару пераможцаў, якая атрымала тытул «Знахар». Можам толькі сказаць, што этап «Вясковыя будні» быў інтэлектуальным конкурсам і прысвячаўся гісторыі сялянства, жывапісу і мастацтву на сельскагаспадарчую тэматыку. Ладзіўся ён на базе КУП «Падсвільскі завод харчовых прадуктаў» у г.п. Падсвілле (дырэктар прадпрыемства Валерый Акуленка).

Трэба заўважыць, што па некаторых аб'ектыўных прычынах у чарговасці этапаў праекта адбыліся змяненні. Памянёны вышэй конкурс павінен быў адбыцца ў маі. Наступны — конкурс касцоў «Вострая каса» — ідзе па плану. Адбудзецца ён у гэту суботу на базе СВК «Залатая падкова» ў вёсцы Бабічы (старшыня Анатоль Пачапко). Удзельнікам трэба будзе, па ўмовах спаборніцтва, навастрыць касу і скасіць участак. Нагадаем, што ў праекце прымаюць удзел як вясковыя, так і гарадскія сем'і, што маюць дзяцей да 18 гадоў. Пераможцы атрымаюць тытул «Касец» і будуць узнагароджаны каштоўным падарункам ад гаспадаркі, на тэрыторыі якой праводзіцца канкрэтнае спаборніцтва.

Чарговы этап — конкурс гульняў «Залатая падкова» — запланаваны на аўторак 3 ліпеня — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Ён павінен быў адбыцца ў верасні, але ў сувязі са святкаваннямі, якія пройдуць у тым ліку і ў райцэнтры ў пачатку другога летняга месяца, яго было вырашана перанесці. З гаспадарак раёна асноўны удзел у конкурсе будзе браць вышэйпамянёны СВК «Залатая падкова». Сем'ям-канкурсантам трэба будзе запрэгчы ў калёсы каня, здаць «фігурнае» ваджэнне. Пераможцу чакае тытул «Коннік» і каштоўны прыз.

Сяргей РАСОЛЬКА.



«ДРУГІ ХЛЕБ» ЛАДУЦЬКІ І БАБІНОВІЧА

Фермеры з-пад Новай Нівы сцвярджаюць, што дрэннай зямлі не бывае, бываюць кепскія гаспадары



Прыватны сектар ў вёсцы атрымаў актыўнае развіццё дзесьці на пачатку 1990-х. З таго часу, канешне, шмат што змянілася, многія з тых, хто пачынаў сваю справу на зямлі, не вытрымалі выпрабаванняў. Аднак пэўная колькасць фермерскіх гаспадарак пры ўсіх аб'ектыўных і суб'ектыўных цяжкасцях усё ж здолелі ўтрымацца і знайсці сваё «месца пад сонцам». Цяпер па асобных пазіцыях па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў лідарах менавіта прыватнікі. У людзей не знікае жаданне да працы на зямлі — штогод утвараюцца новыя фермерскія гаспадаркі, якія імкнуцца адшукаць свае «рэцэпты» поспеху...

Вартая перавага

Леанід Ладуцька і Віктар Бабіновіч фермерствам заняліся адносна нядаўна — у 2001-м годзе. Менавіта тады ў Чэрвеньскім раёне і была зарэгістравана гаспадарка з пяшчотнай і нязвыклай назвай «Ладуцька» (па прозвішчу аднаго з кампаньёнаў). Пачыналі з 14 гектараў зямлі, уласнай тэхнікі тады не было (яе даводзілася арандаваць). Праз пэўны час, калі «узбіліся» на грошы, адразу набылі трактар. Пакрысе дабаўлялі і зямлі: было 40 гектараў, пасля — 50, а зараз апрацоўваюць ужо больш чым 100. У фермерскай гаспадарцы, акрамя Леаніда і Віктара, пастаянна працуюць яшчэ чатыры чалавекі — тры механізатары і бухгалтар. «Штат», як бачым, зусім невялікі, але з усім гэтыя людзі спраўляюцца паспяхова.

Побач — вёска Новая Ніва, дзе нарадзіўся Леанід Ладуцька. У тутэйшай гаспадарцы (раней гэта быў саўгас «Ніва», а цяпер — камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Новая Ніва») ён адпрацаваў два дзесяткі гадоў — прайшоў шлях ад брыгадзіра да галоўнага агранома. Аднак увесь час марыў аб уласнай справе, спрабаваў розныя варыянты, пакуль не «асеў» у родных мясцінах. Змяняць стыль жыцця («профіль», як кажа Ладуцька) вельмі ўжо не хацелася, таму і вярнуўся да спрадвечнага сялянскага занятку.

— На сябе працаваць значна цяжэй, — заўважае Леанід. — Узровень адказнасці значна большы, укладваеш свае сродкі і сродкі немаленькія. Заўсёды рызыкуеш — у любы момант можаш застацца без нічога. Гэта ж не прамысловая вытворчасць, нават калі арганізацыя не «кульгае», усё адладжана, тым не менш многае залежыць ад «нябеснай канцылярыі». Калі хочаш дасягнуць станоўчых вынікаў, развівацца, то трэба ўвесь час «круціцца», інакш нельга. Аднак тут ёсць неаспрэчная перавага, якая, напэўна, вартая ўсіх цяжкасцяў: ты свабодны ў выбары і займаешся тым, што лічыш мэтазгодным рабіць. Калі гэта адчуеш, то сапраўды здольны на многае.

Ладуцьку зараз 51 год — час, як ён сам лічыць, адказных рашэнняў і сур'ёзных спраў. Многае з таго, аб чым раней нават і марыць не мог, паціху ўвасабляецца ў жыццё. Даволі цяжка прыйшлося менавіта на пачатковым этапе, калі вельмі не хапала абаротных сродкаў. У вялікія крэдыты ўлазіць не хацелася, бо ўмовы ўжо іншыя, чым былі, напрыклад, у пачатку 1990-х. «Першай хвалі» айчынных фермераў тады сапраўды пашанцавала — падчас інфляцыі вяртаць пазыкі можна было без асаблівых праблем. Тады многія імкнуліся разгарнуць уласную справу: як узгадвае Ладуцька, у бліжэйшай акрузе працавалі 13 фермерскіх гаспадарак. Зараз не засталося ніводнай...

Бацьку ў яго справе дапамагае сын Алег — калі ў таго выпадае вольны час. Старэйшыя дочкі і жонка пакуль канчаткова не вызначыліся наконт таго, ці ісці ў фермерства. Віктар нікога не прымушае, паколькі лічыць, што выбар заўсёды трэба рабіць асэнсавана. Праца на зямлі цяжкая і адказная, і не кожны здолее з ёй справіцца.

Унікальны прадукт — бульба

Жывёлагадоўляй фермеры не займаюцца, іх асноўная спецыялізацыя — вырошчванне гародніны. Набор культур, можна сказаць, традыцыйны: капуста, сталовыя буракі, морква, крыху памідораў. Ураджаі ў іх стабільна высокія, праўда, вагаюцца ў той ці іншы бок у залежнасці ад надвор'я. «Амплітуда», здаецца, атрымліваецца значная. Аднак вынікі сапраўды ўражваюць: буракоў кампаньёны збіраюць па 400 цэнтнераў з гектара, морквы — 500—700, а капусты — ажно тысячу ц/га. Стаўку робяць менавіта на раннюю гародніну, паколькі тут такі прынцып: хто першы выйдзе на рынак са сваёй прапановай, той і значна большыя шанцы на поспех мае. А фермеры дакладна пралічваюць эканамічную кан'юнктуру. Мяркуйце самі: цяпер тая ж ранняя капуста рэалізуецца ў сярэднім па 1600—1800 рублёў за кіло, а позняя летась ішла ўсяго за 300 руб. Вось вам і ўся «арыфметыка»!

Асноўная ўвага — бульбе. Пэўна, зусім не будзе перабольшваннем, калі сказаць, што ў вырошчванні «другога хлеба» фермеры выйшлі ўжо на буйнатаварныя формы. Цяпер пад бульбай у кампаньёнаў каля 60 гектараў. Ураджайнасць гэтай традыцыйнай для беларусаў сельскагаспадарчай культуры дасягае 400 цэнтнераў з гектара. Няцяжка падлічыць, з якімі аб'ёмамі рэалізацыі даводзіцца мець справу.

— Бульба — надзвычай актуальны, сапраўды ўнікальны прадукт, — лічыць Віктар Бабіновіч. — «Другі хлеб» заўсёды будзе карыстацца вялікім попытам сярод спажыўцоў. Ёсць шмат гатункаў для самых розных патрэб — цяжка, напэўна, нават прыблізна акрэсліць сферу прымянення гэтай культуры і прадуктаў яе перапрацоўкі. Даўно вядома, што гэта аснова кулінарыі, з бульбы можна прыгатаваць тысячы смачных страў. Сучасны вытворца ў стане забяспечыць любыя запатрабаванні спажыўца наконт уласцівасцяў прадукцыі — мы, напрыклад, вырошчваем 10—15 гатункаў, на любы густ. Асноўная праблема — адсутнасць найноўшых тэхналогій перапрацоўкі. Калі б забяспечвалася гэтая ўмова, то з нашай бульбы можна было б атрымліваць якасны крухмал, які можна нават у ёгурты дадаваць.

Фермеры імкнуцца гаспадарыць на сучасным узроўні: штогод укараняць эфектыўныя тэхналогіі, набываць высокапрадукцыйную тэхніку. Зараз у іх тры трактары з практычна ўсім неабходным навясным абсталяваннем. Праўда, пакуль няма ўласнага вялікага грузавога аўтамабіля. Мяркуюць, што хутка і гэтая праблема будзе вырашана — адправілі заяўку на МАЗ, аднак пэўнага адказу з завода пакуль не атрымалі (кажуць, што прадпрыемства ўсё ніяк не можа вызначыцца наконт цаны). Фермеры ўжо могуць дазволіць сабе набыццё тэхнікі, раней, калі былі малыя плошчы, аб гэтым нават і марыць не маглі. Трактары ў іх айчыннай вытворчасці, а вось бульбаўборачны камбайн нямецкі. Тэхнікай «загадвае» 42-гадовы Віктар Бабіновіч, ён па адукацыі інжынер, дагэтуль працаваў у мясцовым леспрамгасе. З Леанідам яны поруч гадоў з пятнаццаць, яшчэ да фермерства разам шукалі варыянты агульнай справы.

«Офіс» у альтанцы

Сёлета ў вырошчванні бульбы фермеры перайшлі на «тэхналогію 75». Гэтае загадкавае вызначэнне «расшыфроўваецца» проста: адлегласць паміж радамі павялічваецца і бульба расце больш вольна, што дазваляе павышаць ураджайнасць. Як заўважаюць Ладуцька і Бабіновіч, гэта больш прадукцыйная тэхналогія. Калі для агародніны выкарыстоўваецца пераважна замежнае насенне (у асноўным галандскае), то па бульбе аддаюць перавагу толькі айчынным гатункам. У іх, кажуць фермеры, смак лепшы — гэта ўсе спажыўцы адзначаюць.

— А вы кожны гатунак па смаку адрозніваеце?

— Канешне, — адразу адказвае Леанід. — Ёсць і любімыя гатункі: я, напрыклад, больш «паважаю» «Скарб», а Віктар — «Журавінку». Так і нашы пакупнікі: кожны патрабуе і набывае прадукцыю, зыходзячы з уласных пераваг.

На розніцу фермеры даўно не арыентуюцца — аб'ёмы не тыя, рэалізаваць на рынку можна было б, напрыклад, калі б вырошчвалі некалькі гектараў бульбы. А калі 60 га, то ўжо даводзіцца шукаць іншыя каналы збыту. У іх зараз ёсць вялікія заказчыкі — у асноўным гэта сталічныя ўстановы. Пастаўляюць сваю прадукцыю і ў Чэрвеньскі раён, а таксама ў бліжэйшыя Бярэзінскі, Асіповіцкі, Барысаўскі. Ёсць планы выйсці на расійскі рынак — гэта, канешне, вялікая перспектыва. Пакуль бульбу ў кампаньёнаў забіраюць пасрэднікі, але хутка, напэўна, усё ж удасца выйсці на прамыя кантакты з Масквой, Пецярбургам, Мурманскам, Псковам.

Прадукцыя ў фермераў экалагічна чыстая — «хіміі» імкнуцца выкарыстоўваць па мінімуму. Аднак, як яны заўважаюць, спажыўцоў у большасці ўсё ж цікавіць менавіта знешні выгляд, а не «змест»: каб агародніна блішчэла і ў слоік залазіла. І прыводзяць прыклад — летась у іх выраслі буйныя памідоры, якія ў спажыўцоў не карысталіся попытам. Калі людзі пакаштавалі, то прыходзілі яшчэ і яшчэ, бо фермерскія таматы прыйшліся да густу. «На Захадзе зараз імкнуцца вырошчваць экалагічна чыстую прадукцыю, — заўважае Бабіновіч. — І кошт у яе значна вышэйшы».

Фермеры з трывогай глядзяць на неба — ані хмаркі. А дождж вельмі патрэбен, паколькі можна не далічыцца ўражаю. «Офіс» у фермераў своеасаблівы: вялікая ўтульная альтанка, абгорнутая поліэтыленавай плёнкай. Самая зручная і функцыянальная «кантора», якую толькі даводзілася бачыць — побач з палеткамі, на ўскрайку лесу. Праўда, сядзець тут кампаньёнам выпадае вельмі рэдка, паколькі ад цямна да цямна розных спраў хапае.

— Вялікая гаспадарка патрабуе пастаяннага клопату, беражлівага догляду — толькі ў такім разе можна на нешта разлічваць, — заўважае Леанід Ладуцька. — Бо дрэннай зямлі не бывае, бываюць кепскія гаспадары.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
Чэрвеньскі раён

НА ЗДЫМКАХ: так выглядае палявы «офіс» фермераў; «Бульба ўрадзілася добрая», — задаволеныя Леанід ЛАДУЦЬКА і Віктар БАБІНОВІЧ.

Пазнай Беларусь!

УРОКІ ГІСТОРЫІ АД «КАЛЯДЫ-ТУРА»

Больш за 20 экскурсійных тураў па Беларусі прапануе гродзенскае турыстычнае бюро «Каляда-тур» — структурнае падраздзяленне Лядоўвага палаца спорту. Цікавасць да знаёмства са славутасцямі нашай гістарычнай спадчыны ўзрастае: толькі ў маі па самых розных маршрутах, якія распрацаваны фірмай сумесна са спецыялістамі рэгіянальных навучальных устаноў, накіраваліся 23 групы турыстаў (па 40—50 чалавек у кожнай). На думку кіраўніка турбюро Жанны Столяр, добра арганізаваная экскурсія можа стаць для школьнікаў, ды і не толькі для іх, выдатным урокам гісторыі, які запомніцца на ўсё жыццё.

Прыярытэты фірмы бачныя ўжо па афармленню інтэр'ера офіса — тут і калаўрот, і узоры нацыянальнага ткацтва, і збаны, і рыцарская атрыбутыка...

— Вось гэтыя рэчы ткала мая бабуля, — расказвае Жанна Анатольеўна. — А іншае збірала ў падарожжах па Беларусі, ва Украіне. Абавязкова нешта новае прывозім з рыцарскіх турніраў.

— А што гэта за манеты?

— І старадаўнія, і сучасныя, з розных краін. Пачатак калекцыі паклалі мы самі, каб зацікавіць кліентаў нейкай «фішкай», а цяпер і яны прыносяць.

Але галоўная «фішка» турбюро — гэта, канешне, шырокі выбар экскурсійных маршрутаў па нашай краіне. Тут і «Старажытныя замкі Беларусі» (Навагрудак—Мір—Нясвіж—возера Свіцязь), і «Чароўная казка Палесся» (Ружаны—Косава—Марачоўшчына—Лагішын—Дастоева—Пінск), і «Святыні Беларусі» (Ваўкавыск—Сынкавічы—Слонім—Жыровічы), і «Гасцінцам Купалы» (Вязынка—Мінск—Акопы—Харужанцы), і «Горад майстроў» (Мажэйкава—Бярозаўка—Ліда), і «Шляхам старажытных гудаў» (Гудзевічы—Рось—Багатырэвічы—Міневічы), і Аўгустоўскі канал (Гродна—Свяцк—Сапоцкін—Сонічы—Дамброўка—Нямнова)... Па кожнаму маршруту — табліца з коштам праезду (фірма мае аўтобусы «Неаплан», «Мерседэс», а неўзабаве будзе і яшчэ адзін), экскурсійнага абслугоўвання, уваходнага білета на той ці іншы экскурсійны аб'ект.

Галоўныя партнёры «Каляды-тура» — гэта школы, ВНУ, прафсаюзныя камітэты прадпрыемстваў і арганізацый.

— Цяпер, летам, вельмі цікавяцца адпачынкам у Крыме, — гаворыць Жанна Столяр. — Але кожны, хто прыходзіць да нас па пуцёўку, атрымлівае і рэкламу падарожжаў па Беларусі. Перадайце, прашу, вашаму старшыні прафкама, мо зацікавіцца. І попыт ёсць. А ў школы з прапановамі па экскурсійных турах мы ідзём самі, з дапамогай перасоўнага стэнда. Шкада толькі, што экскурсіі для навучальных устаноў дазволены толькі па суботах і нядзелях — у гэтыя дні аўтобусаў для ўсіх жадаючых не хапае, праблематычна з экскурсаводамі. Да таго ж, шмат цяганіны з афармленнем дакументаў на экскурсію школьнікаў, не пазайздросціш настаўнікам, якія павінны абысці ўсе інстанцыі.

— Якія настроі пераважаюць сярод вашых кліентаў: жаданне адпачыць альбо пазнаць Беларусь?

— Яны, як правіла, стараюцца як мага больш убачыць. Хоць вельмі важна, асабліва для дзяцей, і тое, што спадарожнічае знаёмству з экскурсійнымі аб'ектамі. Патлумачу сваю думку ўбачаным у Тунісе. Сярод работнікаў тутэйшага турсэрвісу важная роля належыць аніматарам — людзям, якія прафесійна займаюцца арганізацыяй адпачынку турыстаў. Раніцай яны — са свісткамі, запрашаюць на зарадку. Увечары — стаяць у фраках ля бараў. Заходзіш у клуб — аніматары ўжо на сцэне, праводзяць віктарыны. Пайшлі пагуляць у тэніс — яны цягнуць п'едэстал, на рукавах — медалі, аб'яўляюць, што група беларускіх турыстаў праводзіць турнір, каментуюць яго... Аніматары — гэта работнікі будучыні ў сферы турызму і адпачынку, і нам, лічу, абавязкова трэба рыхтаваць такіх прафесіяналаў у навучальных установах. Бо адна справа — сфатаграфавацца з рыцарам, які стаіць, як укапаны, у адным месцы. І зусім іншы эфект — калі ў Нясвіжы вас сустрэне тэатралізаваная група з тых жа рыцараў, прыдворных дамаў у гістарычных касцюмах і паспрабуе зачараваць нейкім дзействам.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Рэпарцёр атрымаў заданне...

...ПАКАЗАЦЬ ДЭБАШЫРУ ЯГО МЕСЦА

А яно, гэтае месца, у дадзеным выпадку было не што іншае, як медыцынскі выцвярэзнік, дзе чалавек той «адпачне» ноччу, праспіцца, адгоніць ад сябе алкагольную ачмурэласць і, магчыма, успомніць, за што яго туды даставілі. Камандзір першага ўзвода першай роты палка патрульна-паставой службы ўпраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Кацуба, камандзір аддзялення Юрый Навуменка, міліцыянер-вадзіцель Юрый Удовенка і я.

А восьмай гадзіне вечара мы выехалі на дзяжурства па ахове правапарадку ў Цэнтральным раёне Гомеля. Першы патрульны нарад, які сустрэўся нам каля рэстарана «Беларусь», далажыў камандзіру ўзвода, што ўсё спакойна на дадзеным участку, ніякіх правапарушэнняў няма. Едзем далей, у Парк культуры і адпачынку імя Луначарскага, і на выхадзе з яго бачым другі патрульны нарад. Толькі пачалі слухаць іх рапарт, як з аўтобуса трэцяга маршрута, што спыніўся недалёка ад нас, пачулі голас кандуктара. Жанчына клікала на дапамогу. Аказваецца, там «раскачагарыўся», як высветлілася пасля, 42-гадовы Сяргей В., жыхар прыгараднага пасёлка Янтарны. Ён чапляўся да пасажыраў, брудна лаяўся на іх, і, калі кандуктар зрабіла заўвагу так абразіў яе, што жанчына не вытрымала.

Мы папрасілі дэбашыра выйсці з аўтобуса. Па яго знешняму выгляду было відаць, што мужык добра-такі ўзяў на грудзі. Да яго, пэўна, як кажуць, не даходзіла, што перад ім ахоўнікі правапарадку, бо ён паводзіў сябе агрэсіўна, агрызаўся, пагражаў, што «дабярэцца» да ўсіх і кожнага. Кацуба, як гэта і належыць, перш чым пасадзіць яго ў міліцэйскую аўтамашыну, праверыў, ці мае ён нейкія колючыя ці рэжучыя прадметы. Так і ёсць — нажніцы, металічная расчоска з вострым канцом (для якіх мэтаў мужык носіць іх з сабой?).

У выцвярэзніку ён паводзіў сябе гэтак жа, даказваючы, што зусім не п'яны ад нейкіх ста грамаў... Лабараторным жа метадам было ўстаноўлена, што ён, як гаворыцца, адхапіў 2,6 праміле алкаголю, і мужыка змясцілі на адзін з ложкаў выцвярэзніка. Спаць. У гэты час сюды прывезлі трох маладых мужчын, якія на прыпынку тралейбуса на вуліцы Інтэрнацыянальнай абдымаліся, у п'яным чадзе высвятлялі, хто каго больш паважае.

Генадзь Давыдзенка і Яўген Зоркін былі на веласіпедах і неслі службу ў мікрараёне «Волатава». Міліцыянеры далажылі, што ўсё тут спакойна. І мне чамусьці падумалася, ці такая ўжо эфектыўная аддача ад велапатруля ў гэтым густанаселеным жылым масіве, дзе парушальніка ў дварах дамоў не так проста дагнаць на веласіпедзе. Аб чым і выказаў сваё меркаванне.

— Памыляецеся, — адказаў мне Уладзімір Кацуба. — Можна прывесці нямала прыкладаў таго, як велапатруль наводзіў парадак. Справа ў тым, што дзяжурства на веласіпедах нарады нясуць у зоне адпачынку, якая займае вялікую тэрыторыю. Каб кантраляваць тут сітуацыю, патрэбны тры-чатыры пешыя нарады. На веласіпедах жа дастаткова аднаго. Гэтымі днямі каля возера ў кустах трое маладых хлопцаў варылі наркатычнае малачко. Веланарад выявіў іх і выклікаў групу затрымкі. У другім выпадку мужчыну, які выхапіў грошы ў прадаўшчыцы ларка, уцячы ад міліцыянераў на веласіпедах не ўдалося. А ў трэцім Зоркін і Давыдзенка атрымалі з дзяжурнай часці міліцыі паведамленне аб тым, што каля дома № 13 па вуліцы Макаёнка збіваюць таксіста. У той момант яны знаходзіліся каля Лядоўвага палаца, на вялікай адлегласці ад месца здарэння, і ўсяго за чатыры хвіліны пераадолелі яе. Зламыснікаў, якія зніклі ў адным з пад'ездаў, шукаць а дванаццатай гадзіне ночы было цяжка. Апытаўшы аднаго-двух сведак, патрульны нарад выклікаў участковага, групу аператыўнікаў, і ўсе разам пачалі дзейнічаць. У выніку, на чыстую ваду былі выведзены не толькі двое хуліганаў, якія білі таксіста, але яшчэ і чатыры наведвальнікі «прытона», што мелі розныя правапарушэнні. Усе яны панеслі пакаранне.

Адно з крымінагенных месцаў горада — тэрыторыя, якая прылягае да чыгуначнага і аўтобуснага вакзалаў, куды я накіраваўся ўжо на іншай міліцэйскай машыне разам з камандзірам трэцяй роты палка патрульна-паставой службы Сяргеем Нязнаевым і міліцянерам-вадзіцелем Яўгенам Габрыкавым. Патрульны нарад у складзе Мікалая Будніка і Леаніда Пастухова далажыў, што з моманту іхняга дзяжурства ніякіх парушэнняў правапарадку не зафіксавана, хоць прайшло ўжо чатыры з паловай гадзіны.

— Магчыма, усё яшчэ наперадзе? — спытаў я ў іх.

— Усякае можа быць, асабліва пасля адзінаццатай-дванаццатай гадзіны ночы. А наогул — не ўгадаеш, калі можа ўзнікнуць бойка групы моладзі, крадзеж або нешта іншае, — адказалі яны. — Вось нядаўна каля сямі гадзін раніцы двое мужыкоў бамжаватага выгляду неслі вялікую сумку каля магазіна «Вёсны». Адзін з іх малады, другі — пажылога ўзросту. Вырашылі пацікавіцца, дзе яны набылі такую сумку і куды так спяшаюцца. Мужыкі не змаглі даць пераканаўчыя тлумачэнні. Яшчэ б! У сумцы знаходзілася 6 блокаў цыгарэт і прайгравальнік, аб прапажы якога з кватэры ў міліцыю заяўляў адзін жыхар абласнога цэнтра.

На нашым шляху трапіўся яшчэ адзін велапатруль. Гэта ўжо ў другім канцы горада, у сельмашаўскім мікрараёне, дзе таксама вялікая зона адпачынку. Міліцыянер Сяргей Гуцаў і Дзмітрый Лукашоў расказалі, як літаральна ўчора яны ўцяхамірылі 24-гадовага дэбашыра, які перашкаджаў людзям купацца ў возеры, раскідваў іхняе адзенне, брудна лаяўся. Калі ж патрульныя даведаліся аб гэтым ад грамадзян, то папярэдзілі яго аб магчымых выніках парушэнняў правапарадку. У адказ бамбіза, спадзеючыся на сваю п'яную сілу, палез да іх біцца. Не ўлічыў, што міліцыянеры валодаюць прыёмамі самба. Падсечка. Наручнікі.

У гэтым сельмашаўскім мікрараёне не маглі мы абмінуць і аздараўленчы цэнтр «Бадзёрасць» і магазін каля яго, якія працуюць і днём, і ноччу. На той момант народ каля апошняга пачаў толькі збірацца, каб папіць слабаалкагольныя напоі — джынтонік ці піва).

Колькі ўжо напісана рапартаў і зваротаў у адпаведныя органы з просьбай закрыць гэты «начнік», бо пасля 20 гадзін грамадзянамі тут набываюцца не тавары першай неабходнасці (хлеб, малако і г.д.), а алкаголь. Аднак воз і зараз там. Між тым, вядома, што закрыццё падобнага магазіна «Спадарожнік» па вуліцы Яфрэмава на 70 працэнтаў знізіла колькасць злачынстваў.

— У тыя суткі, калі вы прынялі ўдзел у патруляванні, — сказаў мне намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі і спецыяльнай міліцыі, начальнік упраўлення аховы правапарадку УУС Гомельскага аблвыканкама Юрый Селіванаў, — у Гомелі нашай службай было затрымана 18 чалавек за дробнае хуліганства і 24 дастаўлены ў выцвярэзнік. Ёсць і такая статыстыка. З пачатку года ў грамадскіх месцах было ўчынена 269 хуліганскіх выхадак, 240 грабяжоў і па гарачых слядах раскрыта іх адпаведна 176 і 97. Па вобласці з 722 хуліганскіх учынкаў раскрыта 501, а з 538 грабяжоў у 238 выпадках зламыснікі затрыманы.

Патрульна-паставыя службы ёсць не толькі ў абласным цэнтры, але і ў Светлагорску, Мазыры, Рэчыцы, Калінкавічах, Петрыкаве, Жыткавічах, Добрушы, Гомельскім раёне. Дзяжурства яны нясуць у трохзменным рэжыме і дапамагаюць ім у гэтым ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў і дружыннікі. У Гомелі і іншых буйных гарадах з 22 да 6 гадзін патрулююць начныя аўтаэкіпажы.

— За суткі, — уключаецца ў размову намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку УУС аблвыканкама Сяргей Шапецька, — у грамадскіх месцах дзяжурыць да трохсот чалавек. Акрамя патрульна-паставых службаў, за парадкам сочаць супрацоўнікі дэпартамента аховы, дзяржаўтаінспекцыі, медвыцвярэзніка, участковыя інспектары і інш. За пяць месяцаў гэтага года ў параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам злачыннасць у грамадскіх месцах горада знізілася на 37 працэнтаў.

— І ўсё ж што вас хвалюе?

— Рост злачыннасці, учыненай у п'яным выглядзе, — адказалі Юрый Вітальевіч і Сяргей Мікалаевіч. — Яна павялічылася на 16 працэнтаў, паглядзіце, што робіцца на вуліцах. Моладзь — і хлопцы, і дзяўчаты — ходзяць у абдымку з бутэлькамі піва і джынтоніка. Міністэрства ўнутраных спраў ўносіла прапанову ва ўрад рэспублікі забараніць распіццё слабаалкагольных напояў у грамадскіх месцах, але яна пакуль не прынята.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАКІСТАНСКІ «ДЭСАНТ»

**Беларускія памежнікі затрымалі непадалёк ад Кобр

РАСЦІ ВЯЛІКІМ, МАЛЫ!

Аліса — самая маленькая пацыентка аддзялення рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёння сюды, у аддзяленне, нярэдка заходзяць мамы з дзецьмі, якія некалі нарадзіліся неданошанымі. Днямі жанчына прывяла двухгадовага жвавага карапуза, які нарадзіўся вагой 860 грамаў.

— Цудоўны хлопчык! Мы паказалі яго нашым мамам, якія ляжаць у палатах з неданошанымі дзеткамі. Такія жанчыны заўсёды глядзяць у будучае з асцярогай і няўпэўненасцю. І, у прынцыпе, маюць рацыю — нараджэнне неданошанага дзіцяці практычна заўсёды нясе з сабой пэўную рызыку. Таму бачыць прыгожае, здаровенькае дзіця для нашых мам сапраўднае суцяшэнне, — гаворыць Марыя Некрашэвіч.

Неданошанае дзіця — гэта дзіця, народжанае ад 22 да 37 тыдня цяжарнасці. Гаворачы аб неданошанасці, маюць на ўвазе не вагу (як памылкова думаюць многія), а менавіта тэрмін цяжарнасці. Часам неданошанае дзіця можа важыць і больш, чым патрэбна па тэрміну, але ўсё роўна значна адстае ў развіцці.

Гэтак жа, як генетыкамі вызначаюцца 5 працэнтаў агульначалавечай рызыкі нараджэння дзяцей з парокамі развіцця, прагназуецца і рызыка заўчасных родаў і нараджэння неданошаных дзяцей. Прычым, ва ўсім свеце — нават там, дзе ўзровень жыцця і назірання за цяжарнасцю наладжаны на некалькі парадкаў вышэй, чым у нас. У акушэраў ёсць такое паняцце, як група рызыкі па невыношванню. У гэту групу ўваходзяць жанчыны, у якіх ужо былі заўчасныя роды, аборты ці выкідышы. А таксама тыя, хто мае ў анамнезе венерычныя захворванні — ВІЧ, сіфіліс, хламідыёз, герпес... Апошнія, па словах медыкаў, з'яўляюцца прычынай неданошанасці плода ў 70 працэнтах выпадкаў.

Прыкладна 250—270 неданошаных немаўлят з'яўляецца на свет у Мінскім абласным раддоме на працягу года. 220—240 з іх праходзяць праз аддзяленне рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі нованароджаных. 50—60 маюць вагу да 1,5 кілаграма і экстрэмальна нізкую — да 1 кілаграма. Прыкладна 97 працэнтаў неданошаных дзяцей выжываюць.

— Увогуле, мы не багі, але шанц павінны даць усім, хто нарадзіўся жывым, — гаворыць урач аддзялення рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі нованароджаных Ванда Адаська.

Яшчэ дзесяць—пятнаццаць гадоў таму глыбока неданошанае дзіця, народжанае на 24-25 тыдні цяжарнасці, урачы наўрад ці здолелі б выхадзіць. Сёння за станам здароўя такіх чалавечкаў вядзецца маніторнае назіранне. Усе неданошаныя немаўляткі (яны паступаюць у рэанімацыю непасрэдна з радзільнай залы) змяшчаюцца ў інкубатар (кювез) — закрытае асяроддзе са шкляными дзвярцамі, дзе ўтвараюцца спецыяльная тэмпература і ўзровень вільготнасці. У інкубатары адчыняюцца акенцы — такім чынам сястра можа працаваць з малым. Кормяць іх сцэджаным мацярынскім малаком цераз зонд, паколькі есці самастойна маленькія не могуць. Да таго ж, у большасці выпадкаў у іх адсутнічае дыхальная функцыя, не забяспечваецца тэмпературны рэжым.

...620-грамовая Аліса такая маленькая, што, здаецца, змясцілася б на дзвюх састаўленых далонях. Мікраскапічныя пальчыкі сціснуты ў кулачкі. Да ручкі і носіка падведзены трубачкі.

— Дзіця пакуль не можа дыхаць, за яго «дыхае» апарат, — тлумачыць Ванда Адаська. — А вельмі неабходна, каб малое прыстасавалася дыхаць само. Калі доўга трымаць яго на апараце, можа развіцца лёгачная дысплазія, незваротныя змяненні ў тканках. Але адмянаць штучнае «дыханне» раней тэрміну таксама небяспечна... Вось і ходзім па лязу, пільна кантралюючы ўсе гэтыя моманты.

Ванда Іосіфаўна ўпэўнена, што выратаваць дзіцячае цельца яшчэ не азначае выратаваць жыццё. Галоўнае — «выхадзіць» інтэлект, знізіць рызыку інвалідызацыі.

Чым больш няспелым з'яўляецца на свет немаўлятка, тым горш яно паддаецца лячэнню. Праз інтубацыйную трубку ў трахею нованароджанага ўводзяцца спецыяльныя прэпараты для падтрымання лёгкіх у разгорнутым стане. Практычна кожны малы ў рэанімацыйным аддзяленні атрымлівае інфузійную тэрапію (або кропельніцу). Каб знайсці венку на танюткай ручцы, неабходна вялікае майстэрства. Гэта сапраўды ювелірная работа, якую не ўсё медсёстры могуць выканаць. Тут іголкі, якімі робяць укол, не таўсцей за валасок. Каб беспамылкова патрапіць у венку, неабходна лёгкая рука і пэўны вопыт.

Аддзяленне рэанімацыі разлічана на 12 месцаў, якія ніколі не пустуюць. Адзін кювез для выходжвання неданошанага немаўляці каштуе 12 тысяч еўра. Апарат для штучнага дыхання — 32 тысячы еўра... Але загадчык аддзялення Сяргей Качан упэўнены, што грошы, укладзеныя ва ўкараненне новых тэхналогій, акупяцца сторазова. На яго думку, няма больш рацыянальнага размяшчэння грошай, чым укладанне іх у здароўе дзяцей. Сяргей Эдмундавіч, які неаднойчы быў на стажыроўцы за мяжой, сцвярджае, што абсталяванне аддзялення рэанімацыі нованароджаных у раддоме на 80 працэнтаў адпавядае еўрапейскім стандартам. (Праўда, там яно не дапрацоўвае да поўнага зносу.)

У аддзяленні рэанімацыі малыя праводзяць ад некалькіх дзён да некалькіх тыдняў. Пры паляпшэнні стану і стабілізацыі асноўных функцый (дыхання, ссання, тэмпературнага рэжыму) дзіця пераводзіцца на другі ўзровень выходжвання — у педыятрычнае аддзяленне для нованароджаных з неўралагічнай паталогіяй і неданошаных. Тут ужо малюткі ляжаць выключна з мамамі. Функцыя мамы вельмі важная — яна павінна быць побач. У сувязі з нейкімі абставінамі жанчыну могуць ненадоўга адпусціць дадому — але з умовай бясспрэчнага вяртання. Наяўнасць мамы — вялікі «плюс» у сэнсе прафілактыкі інфекцый, для малога больш карысна, калі з ім кантактуе родны чалавек, а не медперсанал. Мама — яна адначасова і псіхолаг, які можа супакоіць адным нават дакрананнем.

Мама ж сочыць і за тэмпературным рэжымам, вельмі важным для неданошаных дзяцей. Яе вучаць «трымаць» тэмпературу дзіцяці ў межах нормы — і падчас знаходжання ў аддзяленні, і, што вельмі важна, пасля выпіскі. Калі дома мама не будзе сачыць за тэмпературным рэжымам, тэмпература цела малога можа ўпасці ніжэй крытычнай адзнакі, і немаўлятка зноў трапіць у рэанімацыю. Марыя Пятроўна Некрашэвіч сцвярджае, што ў плане догляду неданошаных немаўлят мамы, якія выходзяць з іх аддзялення, бываюць больш падкаванымі, чым некаторыя патранажныя сёстры. Менавіта таму, што дзень і ноч выстойвалі ля маленькага.

Але рызыка захворванняў застаецца высокай на працягу ўсяго першага года жыцця немаўляткі — з неданошанымі дзеткамі трэба ўвесь час быць асцярожным. На жаль, пэўны працэнт глыбока неданошаных дзяцей (народжаных на 24—25-ы тыдзень цяжарнасці) пачынае часта і доўга хварэць на прастуду. Прычына — бронха-лёгачная дысплазія, калі частка лёгачнай тканкі не ўдзельнічае ў працэсе дыхання.

Ці трэба трымаць такіх малых у «цяплічных умовах»? Урачы лічаць, што гэта нераэальна і немэтазгодна. Дастаткова выключыць зносіны з хворымі і курыльшчыкамі, вось і ўсё. А ў «цяплічных умовах» у дзіцяці ніколі не выпрацуецца імунітэт. У рэшце рэшт, пры правільным доглядзе неданошаныя малыя «даюць» вялікі працэнт здаровых дзяцей.

Медыкі сцвярджаюць, што ад неданошаных дзетак мамы адмаўляюцца не часцей, чым ад звычайных. (Галоўная прычына адмовы — адсутнасць мужа.) неданошаны малы, ад якога адмовілася мама, паддаецца выходжванню значна горш, чым іншыя дзеці, нягледзячы нават на тое, што становіцца цэнтрам увагі і клопату ўсяго медперсаналу...

— Мы не асуджаем такіх маці, але спрабуем іх пераканаць. Ад малых можна атрымаць столькі разнастайных эмоцый!.. І адмоўных — калі ім цяжка, калі яны знаходзяцца на валасок ад смерці, змагаюцца за жыццё... І станоўчых — калі ім робіцца лепш, калі яны пацягваюцца, усміхаюцца, пазяхаюць. Гэта такія маленькія сонейкі. Для нас, персаналу, кожны медагляд — своеасаблівая псіхатэрапія, — гаворыць урач педыятрычнага аддзялення Галіна Драгун. На думку Галіны Аркадзьеўны, нованароджаныя дзяўчынкі змагаюцца за сваё жыццё больш актыўна, чым хлопчыкі. Але шанц ёсць у кожнага з іх, тым больш пры сучасных дасягненнях рэанімацыі. Пакуль тоненькая нітачка будзе звязваць дзіця з гэтым светам, урачы зробяць усё магчымае, каб не даць яму пайсці...

— Нам сапраўды не соромна за ўзровень нашага матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, — пацвердзіла намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай дапамозе Тамара Аляксандрава. — Пачынаючы з 90-х гадоў, абсталяванне для аддзялення рэанімацыі нованароджаных закуплялася пастаянна. Асабліва гэта адчувалася апошнія два—тры гады, за што, канешне, вялікі дзякуй абласному выканкаму і Міністэрству аховы здароўя.

Разам з тым, гаворыць Тамара Канстанцінаўна, апошні час у раддоме адчуваецца яўны недахоп койка-месцаў з-за павелічэння колькасці родаў. І калі жанчыны пачнуць раджаць яшчэ больш актыўна, медыцынскую ўстанову чакаюць сур'ёзныя праблемы.

— Мы ўжо адчуваем патрэбу ў новым корпусе. На жаль, пакуль што дзяржава не можа пайсці нам насустрач, хіба што адбудзецца невялікая рэканструкцыя старых карпусоў і рамонт. Але ўжо сёння медперсанал працуе з перагрузкай...

Рэанімацыйнае і педыятрычнае аддзяленні для нованароджаных перагрузку таксама адчуваюць. Пакуль што гэта практычна не ўплывае на якасць медыцынскай дапамогі немаўлятам і іх мамам. Але, як сцвярджаюць урачы, у хуткім часе нараджэнне неданошаных дзяцей увогуле перастане быць сенсацыяй і ператворыцца ў норму. Ці будуць гатовы спецыялізаваныя аддзяленні радзільных дамоў да такога развіцця падзей? Медыкі спадзяюцца на лепшае.

Наталля КАРПЕНКА.

Далонька маленькага пацыента на далоні доктара.

Медыцынскія сёстры Марына РАДЗЮК і Таццяна МАСЕЕНКА каля інкубатара з немаўляткам.

У пакоі рэанімацыі працэдурная сястра Марына ДРАЗДОВА, урачы-рэаніматолагі Аляксандр СУШЧЭЎСКІ і Ванда АДАСЬКА.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

Дзённік Вікі Ц.

Я завітала ў госці да гэтага чалавека выпадкова. Знаёмы маіх знаёмых, жыве адзінока, мае за плячыма багаты педагагічны вопыт і цікавы лёс. А мо, і звычайны, проста ён вельмі цікава аб сваім жыцці расказвае, калі дапускае суразмоўцу ў «асабістую прастору».

Але здзівілі не нашы душэўныя пасядзелкі далёка за поўнач, а чысціня ў сціплым пакойчыку — так мог бы выглядаць прыбраны палац Снежнай каралевы. У кожнай рэчы — не проста сваё належнае месца, а месца максімальна зручнае і прывабна аформленае... Пагаманіўшы, мы селі піць гарбату (менавіта гарбату — складаную, з уласнаручна сабраных зёлак, а не куплёны чай). Я раней бачыла такое толькі ў рэкламе: дзеля чаявання на дваіх чалавек цалкам сервіраваў стол, дастаўшы булачкі ў кошычку, масла ў маслёнцы, тонкай работы кубкі, сподачкі, — нават сітца для заваркі і шчыпцы для цукру! Убачыўшы маю адвіслую сківіцу і пяцікапеечныя вочы, гаспадар хітра ўсміхнуўся: «А ты думала, я тут брудам зарастаю? Не, наладзіў сам сабе маленькую цывілізацыю...».

28.06.2007

Каб не развучыцца

Гэтыя словы і зараз час ад часу прыгадваю — калі прыцягваюся дадому «разабраная на запчасткі», і сіл, здаецца, не хопіць нават на тое, каб утрымаць у руках талерку з якім-небудзь перакусам. Насуперак стоме і ляноце, замест таго, каб абысціся наструганай на хуткую руку салатай памідор-агурок, раблю штосьці вытанчанае і мудрагелістае, што потым проста сорамна есці без відэльца і нажа. Ну і няхай сабе затрачу ў тры разы больш часу. Затое захаваю нешта больш важнае — можа, самапавагу?

Канешне, па вялікім рахунку, смак супу не зменіцца, калі не наліць яго з прыгожай супніцы, а сёрбаць проста з каструлі, дый са старога любімага кубка са шчарбінкай наверсе, балазе, кампот яшчэ не выцякае. Калі развіваць ідэю далей, то «сукенка для дома» — недазваляльная раскоша, бо па ўласнай кватэры можна хадзіць і ў «дарэвалюцыйных» драных трэніках — а хто там цябе бачыць, каму ўвогуле якая справа, у чым ты ходзіш? Толькі... Мне здаецца, што праз нейкі час і табе самому будзе глыбока фіялетава, што ты там ясі і як выглядаеш. А чаму навакольныя павінны чалавека любіць і паважаць, калі сам чалавек сябе не любіць і не паважае?..

Зрэшты, гэтая сітуацыя, хутчэй, верагодная для глыбока расчараваных, «стомленых жыццём» прадстаўнікоў старэйшага пакалення. Мае аднагодкі і больш маладыя—ранніе пакутуюць на іншую хваробу — татальную эгаізацыю. Гэтыя аб сабе, любімым, ніколі не забудуцца, а вось наконт астатніх нават не задумаюцца. Менавіта яны з першага года навучання ў ВНУ ліхаманкава шукаюць сабе кватэру — бо нават не дапускаюць думкі аб засяленні ў інтэрнат і неабходнасці ўжывацца з іншымі студэнтамі. Яны не ўяўляюць «дзікага» адпачынку, дзе трэба клапаціцца аб сабе самастойна, хапаюцца за сэрца, калі ўбачаць алюмініевыя талеркі ў студэнцкай сталоўцы і паблажліва крывяць вусны, калі побач праходзіць аднакурснік, апрануты з мясцовага кірмашу. І лячыць гэта, напэўна, ужо запозна — бо трэба было пачынаць яшчэ з дзяцінства. Ёсць як мінімум два цудоўныя спосабы. Або ў вёску да бабулі, дзе ніякіх табе шматгадзінных сядзенняў перад тэлевізарам, затое ў якасці культурнай праграмы — праполка град на хуткасць і экстрэмальнае рэаліці-шоў «пасвім казу». Праўда, зробім агаворку: ёсць такія любячыя бабулі, пасля выхаваўчай работы якіх бацькі толькі ўсплёскваюць рукамі і доўга адвучваюць дзіця ад набытых за лета капрызаў. Ці паняцця «вёска» ўвогуле не існуе для дадзенай сям'і — гараджане ў трэцім ці якім там пакаленні. Тады выдатна спрацоўвае другі метад: аддаць дзіця ў якую-небудзь секцыю-гурток, альбо адвезці на дзве змены ў піянерскі... ой, прабачце, зараз ужо проста ў дзіцячы летнік. Мала хто палюбіць гэтае месца з першага дня і нават з першага разу. Але потым... слёзы на развітанне, клятвы ў вечным сяброўстве, сезонныя сустрэчы і перапіска з любімымі важатымі і выхавальнікамі. І яшчэ — вялікая ўдзячнасць дарослых ужо людзей за той набыты вопыт. За выпрабаваны на сабе заклік «Адзін за ўсіх, і ўсе за аднаго». За ўменне ісці на кампраміс, прыслухоўвацца да іншых — і адстойваць свае меркаванні. За разуменне адказнасці за свае ўчынкі. За тое, у рэшце рэшт, што ты навучыўся будаваць стасункі з іншымі людзьмі і разумець, што дэкларацыі на паперы станоўчыя і высакародныя якасці — адно, а прымяненне іх у жыцці — зусім другое... А калі хто потым забываецца на гэтыя прапіснымі ісціны, добра было б і іх адпраўляць у летнікі, ужо выхавальнікамі. Каб не адвыкалі.

Наогул, з цягам часу ўсе веды і ўменні, як карцінкі ў кнізе, пакрысе выцвітаюць, сціраюцца з памяці. І калі, скажам, маторныя навыкі — плаванне, язда на веласіпедзе — лёгка аднаўляюцца праз некалькі інтэнсіўных заняткаў, то што рабіць з рэчамі як быццам эфемернымі? Што прыдумаць, каб людзі не развучыліся этыкету, або культуры маўлення, або аптымізму? Як «прышчапіць» раз і — назаўжды міласэрнасць, калі нават шокавая тэрапія крымінальных тэленавін ужо не ўздзейнічае на розум і сэрца?

Магчыма, варта на хвіліначку выплыць з хуткаснай плыні паўсядзённых спраў і паглядзець на яе збоку. Дый на сябе таксама. Прыгадаць, што мы пастаянна адкладваем на заўтра або ўвогуле «да лепшых часоў». Уявіць, што гэты дзень — апошні ў жыцці, і, не спасылаючыся ні на што і ні на каго, паспець зрабіць усё. Ці проста спыніцца і падумаць. Каб толькі не развучыцца...

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ЮБІЛЕЙНЫ КОНКУРС «ЗВЯЗДА»-90

Заданне № 27. В. ДЗЯЧУК (5+11). Зваротны мат за 2 хады.



Заданне № 28. С. ТКАЧЭНКА (7+5). Зваротны мат за 3 хады.

ПРАВЕРЦЕ ВАШЫ РАШЭННІ

Змяшчаем адказы цяперашняга конкурсу рашэнняў.

Заданне № 11. 1. f4! gf 2. K:f3 Cb6 3. Ke5; 2. ... Cc7 3. Kd4; 1. ... Cc7 2. Kc4 Cb6 3. Ke5; 1. ... Cb6 2. Kb3 Cc7 3. Kd4; 2. ... Cc5 3. K:a5.

Заданне № 12. 1. Kpb8! ~~ 2. a8Ф. 1. ... Фа1 2. Кс3+ С:с3 3. Фd4+; 1. ... Фа4 2. с4+ Л:с4 3. Лd4+; 1. ... Фс5 2. a8Ф+ Крс4 3. Фа4х.

Заданне № 13. На полі с3 — белы слон (па аўтару). 1. 0-0-0! цугцванг. 1. ... h5 2. Ke1 h4 3. Kf3; 1. ... a3 2. Ka1 h5 3. Kb3; 1. ... a5 2. Ka3 ab 3. Kab5; 1. ... g5 2. Ke3 a3 Kef5. А з пешкай на полі с3 рашае 1. Ke3 de4 2. c4 h5 3. Kd5. Пабочнае рашэнне 1. c4.

Адказы на конкурсныя заданні даслалі Юрый Бандарэнка (Магілёў), Віктар Быкаў і Сяргей Гурыновіч (Мінск), Іван Козел (Мазырскі раён), Аляксандра Маджара (Рэчыца), Анатоль Прынеслік (Віцебск), Пётр Шчамялёў (Бялыніцкі раён). Алег Бадзюкоў (Круглянскі раён) даслаў правільны адказ толькі на заданне № 11.

ЗАПРАШАЕМ ДА ЎДЗЕЛУ

Газета «Вечерний Петербург» аб'явіла чарговы, 14-ы міжнародны конкурс складання двух-, трох-, шматхадовак і эцюдаў. Удзельнічаюць кампазіцыі, якія будуць апублікаваныя ў газеце на працягу 2007—2008 гг. (па адной ад аўтара ў кожным раздзеле). Апошні тэрмін прысылкі для публікацыі і ўдзелу ў конкурсе — 1 ліпеня 2008 года. Творы дасылайце на адрас: рэдакцыя газеты «Вечерний Петербург», «Шахматы для любознательных», ул. Мира, 34, літ. А, Санкт-Петербург, 197101.

То каноплі, то мак

Адна жанчына з Брагіна і мужчына з Петрыкава пасадзілі ў сваіх агародах некалькі градак з макам. Першая можа атрымаць за гэта штраф у памеры дваццаці базавых велічынь, а другі — нават пазбаўленне волі, бо з вырашчанага ўраджаю ён прадаў ледзь не паўпуда макавых каробачак.

Органы ўнутраных спраў вобласці правялі некалькі рэйдаў па выяўленню незаконнага вырошчвання канопляў і маку і знішчылі ў неабжытых месцах каля дзесяці гектараў канопляў у Гомельскім, Чачэрскім і Рэчыцкім раёнах. Яны склалі больш за трыццаць актаў у адносінах да тых грамадзян, якія вырошчвалі мак.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

777

Падары мне сына...

Існуе табліца, па якой яшчэ да зачацця можна вызначыць, хто народзіцца. Аўтарства прыпісваюць старажытным кітайцам, якія амаль тысячу гадоў таму навучыліся вызначаць пол будучага дзіцяці па ўзросту яго маці і месяцы зачацця.

Наколькі яна «надзейная»? Можаце правер-рыць самі — на сваіх жа дзецях, на дзецях сваіх сяброў, свайкоў.

Але ж, калі атрымаецца памылка, крыўдаваць не трэба, бо любое дзіця — дар Гасподні, які трэба любіць і прымаць незалежна ад таго, хлопчыкам ён з'явіўся на свет або дзяўчынкай...

Справа па вертыкалі — узрост маці падчас зачацця, па гарызанталі — месяцы... Засталося сумясціць (Ж — пол жаночы, М — мужчынскі) і даведацца, дарэчы, што жанчыне ў 21 вельмі цяжка зачаць хлопчыка, а ў 30 — дзяўчынку.

Узрост	Студзень	Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
18	Ж	М	Ж	М	М	М	М	Ж	М	М	М	М
19	М	Ж	М	Ж	Ж	М	М	Ж	М	М	Ж	Ж
20	Ж	М	Ж	М	М	М	М	М	М	Ж	М	М
21	М	Ж	Ж	Ж	Ж	Ж	Ж	Ж	Ж	Ж	Ж	Ж
22	Ж	М	М	Ж	М	Ж	Ж	М	Ж	Ж	Ж	Ж
23	М	М	М	Ж	М	М	Ж	Ж	Ж	М	М	Ж
24	М	Ж	Ж	М	М	Ж	М	Ж	М	М	Ж	М
25	Ж	М	Ж	М	Ж	М	Ж	М	Ж	М	М	М
26	М	М	М	М	М	Ж	М	Ж	Ж	М	Ж	Ж
27	Ж	Ж	М	М	Ж	М	Ж	Ж	М	Ж	М	М
28	М	М	М	Ж	Ж	М	Ж	М	Ж	Ж	М	Ж
29	Ж	М	Ж	Ж	М	Ж	Ж	М	Ж	М	Ж	Ж
30	М	М	Ж	М	Ж	М	М	М	М	М	М	М
31	М	М	М	М	Ж	Ж	М	Ж	М	Ж	Ж	Ж
32	М	Ж	Ж	М	Ж	М	М	Ж	М	М	Ж	М
33	Ж	М	М	Ж	Ж	М	Ж	М	Ж	М	М	Ж
34	М	М	Ж	Ж	М	Ж	М	М	Ж	М	Ж	Ж
35	М	Ж	М	Ж	М	Ж	М	Ж	М	М	Ж	М
36	М	Ж	М	М	М	Ж	М	М	Ж	Ж	Ж	Ж
37	Ж	Ж	М	Ж	Ж	Ж	М	Ж	М	М	Ж	М
38	М	М	Ж	Ж	М	Ж	Ж	М	Ж	Ж	М	Ж
39	Ж	Ж	М	Ж	Ж	Ж	М	Ж	М	М	Ж	М
40	М	М	М	Ж	М	Ж	М	Ж	М	Ж	Ж	М
41	Ж	Ж	М	Ж	М	М	Ж	Ж	М	Ж	М	Ж
42	М	Ж	Ж	М	М	М	М	М	Ж	М	Ж	М
43	Ж	М	Ж	Ж	М	М	М	Ж	Ж	Ж	М	М
44	М	Ж	Ж	Ж	М	Ж	М	М	Ж	М	Ж	М
45	Ж	М	Ж	М	Ж	Ж	М	Ж	М	Ж	М	Ж

Вітамін Д супраць раку малочнай залозы

На 50 працэнтаў зніжае рызыку захворвання на рак малочнай залозы прыём вітаміну Д, даказваюць даследаванні амерыканскіх і канадскіх вучоных.

Чым раней жанчыны пачынаюць дапаўняць дыету прадуктамі, якія ўтрымліваюць вітамін Д, тым менш у іх шанцаў захварэць. Карысны вітамін утрымліваецца ў тлустай рыбе — ласосе, тунцы. А пад уздзеяннем сонечных промняў арганізм сам здольны выпрацоўваць частку вітаміну, неабходнага для прафілактыкі раку. Штучным шляхам вітамін Д атрымаць даволі складана. Акрамя таго, у склад большасці полівітамінаў акрамя вітаміну Д уваходзіць яшчэ і вітамін А, які блакіруе дзеянне Д.

СМЯРОТНАЕ РЭХА ВАЙНЫ

У вёсцы Лакуці Шклоўскага раёна ў двары дома загінуў 25-гадовы мясцовы жыхар, паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама. Гранату часоў вайны рабочы мясцовай гаспадаркі трымаў у руках, калі адбыўся выбух.

БЕЛТА.

Дарэчы...

ЗАГАДКА ЗАГАДАК, ЦУД ЦУДАЎ...

Акушэры-гінеколагі і генетыкі, мякка кажучы, скептычна ставяцца да самой магчымасці спланаваць пол дзіцяці, не гаворачы аб эфектыўнасці таго ці іншага спосабу.

Тым не менш, спосабы гэтыя існуюць — некім пралічваюцца, вывучаюцца, даследуюцца. І, верагодна, некаторым парам сапраўды ўдаецца атрымаць спланаваную згодна з імі. Чалавеку ж заўсёды хацелася і хочацца падпарадкаваць сабе тое, што яму непадуладна. Але ўсё-такі не будзем забываць, што зачацце, як, дарэчы, і нараджэнне, новага чалавека — самае загадкавае, што толькі можа быць. Цуд цудаў. І гэтаму цуду трэба давяраць і давярацца. Калі бацькі будуць засцыклівацца на тым, якога полу павінна быць дзіця, яны могуць прычыніць яму вялікую шкоду. З гэтага пункту гледжання спецыялісты не адабраюць нават устанаўленне полу падчас ультрагукавога даследавання. Усё ж такі новы чалавек — гэта Асоба, абсалютна самастойная і ўнікальная, а не цацка для гульні ў «бацькі-дзеці» і не эксперыментальная база для апрабіравання не дасягнутых мэтаў бацькоў, іх не спраўджаных жаданняў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Згубленыя студэнцкі білет і заліковую кніжку № 213/05 на імя **ЖУКАВЕЦ Вольгі Сяргееўны** лічыць несапраўднымі.

Згубленую заліковую кніжку № 217/05 на імя **КЛІМКО Дзяніса Дзмітрыевіча** лічыць несапраўднай.

Згублены студэнцкі білет ПТВ № 24, выдадзены на імя **ГАНЧАРА Аляксея Мікалаевіча**, лічыць несапраўдным.

У суд **Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак грамадзяніна **СІДАРЭНКІ Алега Алегавіча**, 29 мая 1979 года нараджэння, ураджэнца в. Дварэц Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці, апошняе вядомае месца знаходжання — папраўчая ўстанова адкрытага тыпу Жлобінскага РАУС у г.п. Стрэшын Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Сідарэнку А.А., паведаміць іх суду Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ»

извещает, что 9 июля 2007 года состоится внеочередное собрание акционеров по адресу: г. Борисов, ул. Труда, 41.

Начало собрания в 15.00. Регистрация акционеров с 14.00. При себе иметь паспорт.

Повестка дня:

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Минскоблхлебопродукт» путем включения процентов за пользование банковским кредитом.

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт».

Тел. 285-07-52.

РУП «Белспецконтракт» проводит аукцион по продаже автомобильной техники

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

на 6-м открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 11 июля 2007 г.

№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка(руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	Автошасси Урал-375, ш. 299223, дв. 541241	г. Воложин в/ч 30695	1979	3385	5 500 000	550 000
2.	АТМЗ-5-4320М ш. 024740, дв. 213811, с/о 1279	п/о Линово, район Оранчицы, Брестская обл., в/ч 67675Ф	1984	21423	14 000 000	1 400 000
3.	ТЗ-8-255Б ш. 504052, дв. 879751, с/о А843241	п/о Линово, район Оранчицы, Брестская обл., в/ч 67675Ф	1984	6944	20 000 000	2 000 000

6-й аукцион состоится в 11.00 11 июля 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 9 июля 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 618 РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, резиденты Республики Беларусь и нерезиденты, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 12 июля 2007 года.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1 код 357, УНП 101099370. Без НДС. Справки по тел.: (017) тел./факс 224-88-05.

Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com e-mail: info@belspeckontrakt.com

РУП «Белспецконтракт» проводит аукцион по продаже автомобильной техники

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

на 7-м открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 31 июля 2007 г.

№ п.п.	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	АЦ-8,5-255Б з.н. А832239, ш. 470994, дв. 820004	г. Барановичи в/ч 55435Ф	1983	1202	9 000 000	900 000
2.	АЦ-8,5-255Б з.н. А832240, ш. 470487, дв. 816899	г. Барановичи в/ч 55435Ф	1983	1470	9 000 000	900 000
3.	ППЦ-16,3-54112 з.н. 3635 ш. 0020749, дв. 0406350	п. Красный Берег, в/ч 55461Ф	1988	11269	17 000 000	1 700 000
4.	АЦ-8-5334 з.н. А8330682, ш. 53916, дв. 650635	п. Красный Берег, в/ч 55461Ф	1983	12313	8 000 000	800 000
5.	АЦ-8,5-255Б1 с доп. об. ш. 474647, дв. 820899 з.н. А832243	г. Барановичи в/ч 55435Ф	1983	1354	9 000 000	900 000
6.	АЦ-8,5-255Б1 с доп. об. ш. 455363, дв. 783281 з.н. А824434	г. Барановичи в/ч 55435Ф	1982	2224	9 000 000	900 000
7.	АЦ-8,5-255Б1 с доп. об. ш. 449740, дв. 773711 з.н. А823327	г. Барановичи в/ч 55435Ф	1982	1156	9 000 000	900 000
8.	АЦ-8,5-255Б1 с доп. об. ш. 469865, дв. 813380 з.н. А832245	г. Барановичи в/ч 55435Ф	1983	1253	9 000 000	900 000
9.	АЦ-8,5-255Б1 с доп. об. ш. 460590. дв. 796777 з.н. А831034	г. Барановичи в/ч 55435Ф	1983	1370	9 000 000	900 000
10.	АЦ-8,7-5320(М) ш. 248793, дв. 0952130 з.н. 784	г. Барановичи в/ч 55435Ф	1986	37493	12 000 000	1 200 000
11.	ППЦ-16,3-5410 ш. 0114282, дв. 247250 з.н. 4512	г. Барановичи в/ч 55435Ф	1984	60750	21 000 000	2 100 000

7-й аукцион состоится в 11.00 31 июля 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 27 июля 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 618 РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, резиденты Республики Беларусь и нерезиденты, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 1 августа 2007 года.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1 код 357, УНП 101099370. Без НДС. Справки по тел.: (017)тел./факс 224-88-05.

**Наш адрес в Интерн

Добрыя людзі

ХАДЫКА І ЗАПЫЛЕНАЕ ЛЮСТЭРКА

На барселонскіх вуліцах ёсць шмат кінутых аўто. Яны ўсе пакрытыя пылам і брудам. Дзеці пальцамі пішуць і малююць на іх. І мне згадалася гісторыя, расказаная выкладчыкам архітэктурнай кампазіцыі — Алегам Хадыкам. Ён распавядаў тую гісторыю з нагоды, а нагодаю была мая кампазіцыя. Разважаючы пра страх, які выклікае ілюзорная бясконцасць у афортах Джавані Баціста Піранэзі «Сьюіта турмы», я вырашыў зрабіць сваю версію прасторы, запоўненай жахам. Пакой, звычайны пакой, цалкам зашываўся люстэркамі, столь і падлога таксама рабіліся люстранымі. Пасля абшыўкі ўсе люстэркі разбіваліся, біліся, але так, каб не высыпаліся, а заставаліся бітымі на плоскасцях. Бітыя люстэркі засцілаліся празрыстым шклом. Атрымліваўся пакой шкляны і гладкі. Чалавек, трапляючы ў такую прастору, адчуваў, прынамсі, мусіў адчуць жах, бо кожны ягоны рух множыўся і рассыпаўся на безліч рухаў. Рэха рухаў мусіла спарадзіць жах. Хадыка, праслухаўшы мае тлумачэнні да малюнкаў, сказаў, што гульні з люстэркамі ў мастацтве прытойваюць у сабе схаваную небяспеку, а ў якасці прыкладу ён і распавёў гісторыю пра сябе і маму. Пасляваеннае жыццё было паўгалодным і паўжабрацкім. Бязбацькоўства дадавала свае побытавыя цяжкасці. І вось, вучань пачатковай школы — Алег Хадыка, прыйшоўшы дамоў пасля заняткаў, убачыў у вітальні пыл на люстэрку. Указальным пальцам ён акуратна напісаў такі сказ: «Чысціня — залог здароўя!» Хлопчык спадзяваўся, што маці пахваліць яго за такі шэдэўр. Здарылася адваротнае, маці заплакала перад запыленым люстэркам. І яе можна зразумець. Яна адна гадуе сына, робіць усё, каб яму было добра і, адпаведна, чакае ўдзячнасці, а атрымлівае здзеклівы жорсткі папрок. Тут і слёзы. Глядзець у пыльнае люстэрка, якое загаварыла з табою, сапраўды страшна. Той урок я запомніў, і цяпер асцярожна абыходжуся з люстэркамі, як у мастацтве, так і ў жыцці.

КЕРКЬЕГОР І СТРАХ

Калі паверыць Керкьегору, што вера ў вышэйшую сутнасць прыадкрываецца, дзякуючы страху, тады варта згадаць выраз «Ажно дух захоплівае!» Рэакцыя цела на страх — спыненне дыхання, перапыненне яго. Але не кожны сполах, не кожны страх вядзе чалавека да веры. Тады і паўстае жаданне ўдакладніць, а страх чаго, які страх вядзе да Бога? Страх смерці? Хутчэй за ўсё. Але гэта жывёльны страх, а жывёлы, як мы здагадваемся, у Бога не вераць.

МАРГОЛІН І ГАРБАТНІК

На пытанне Зорыка Марголіна, чым я займаюся, кажу: «Перапісваюся з фірмай Муджы, каб паспрабаваць прывезці яе тавары ў Прыбалтыку». Раптам Зорык ажыўляецца: «Муджы? Яны посудам гандлююць! У Парыжы я зайшоў у іх краму, пахадзіў, паглядзеў і сышоў, а ўвечары ўзгадаў іх белы гарбатнічак. Ну такі класны гарбатнічак, ну такі акуратненькі, вытанчаны.... І захацелася мне той гарбатнічак у майстэрні мець. І так захацелася, што я праз увесь Парыж прыехаў у тую краму MUJI. Стаў пад дзвярыма, чакаў адкрыцця, і тут зразумеў, што спазнюся на цягнік. Калі яшчэ пачакаю пяць хвілін, адназначна спазнюся. Давялося выбіраць паміж гарбатнікам і цягніком. Давялося выбраць цягнік, але калі ты прывязеш Муджы ў Прыбалтыку, я абавязкова куплю ў цябе гарбатнічак... Два гарбатнічкі! Дамоў і ў майстэрню! Тры гарбатнічкі...»

КЕРКЬЕГОР І БУНЮЭЛЬ

Эвалюцыйны шлях чалавека Сёрын Керкьегор сфармуляваў і апісаў так: пачуццёвасць, мараль, вера... Выгадная тэорыя для людзей, што нарадзіліся ў асяродках далёкіх ад рэлігіі і веры, а калі чалавек паходзіць з артадаксальнай сям'і, як, да прыкладу, рэжысёр Луіс Бунюэль, дык ягоны шлях можа пайсці ў цалкам процілеглым накірунку ад веры да маралі і яе адмаўлення ў пачуццёвых уцехах.

ТОНІ І MOSCATELLE

Начны парцье Тоні падарыў мне бутэльку Мускатэля. Папярэдне я яму даў пляшку «Белавежскай». Вёз у Барселону, не ленаваўся, бо некалі Тоні мяне выручаў. Ён мяняў мне даляры на песеты з партрэтамі Франка, а я за тыя песеты мог выпіць. Тоні мяне не асуджаў, але, дорачы пятнаццаціградусны Moscatelle, доўга тлумачыў, як яго трэба піць... Пасля вячэры адну чарку, адну і не больш! І табе стане лёгка, цяжкасць у жываце знікне... Пух! Харашо-харашо! Толькі я не піў віна, не піў ні мускатаў, ні вермутаў, ні херасаў з партвейнамі... Піў віскі і гарэлку, гарэлку і віскі. І не па 50, а па 500. Я так ніколі і не навучыўся піць мускатэль пасля вячэры, але Тоні я ўдзячны і за падарунак, і за песеты з партрэтамі Франка, за якія некалі можна было добра напіцца ў Барселоне.

АЛЯКСЕЙ І СКАНДАЛ

У сваім двары сустрэў я жывапісца Аляксея, у яго ў суседнім доме майстэрня на мансардзе. «Добра выглядаеш!» — кажа сусед. «Гэта ад таго, што я завёў новую натуршчыцу!» — кажу. «Маладая?» — «Дваццаць сем гадоў. Выдатная, прафесійная натуршчыца». — «І ў мяне паўгода была натуршчыца, а потым жонка знайшла маленькі чырвоны станік і маленькія чырвоныя майткі. Які быў скандал! Жах!» — «Ведаеш, я таму і ўзяў натуршчыцу прафесійную, з нашай акадэміі, каб размоваў пра станікі не было. А калі яны і пачнуцца, я займу непрымірымую пазіцыю». — «Правільна. Ты сказаў пра маляванне з натуры, і ў мяне стан душы змяніўся, нібыта і я зараз пайду маляваць аголеную, а то ўсё перамалёўваю са слайдаў ды фотак». — «Ёсць яшчэ адна акалічнасць... Натуршчыца за акадэмічную гадзіну працы атрымлівае чатыры тысячы рублёў». — «За два даляры яна пазіруе цэлую гадзіну?» — «Так! Таму адмаўляцца ад малявання — злачынства».

Адам ГЛОБУС.

Усміхнёмся!

Па старажытнай традыцыі выведнікі на пачатку любых перамоў частавалі сваіх гасцей кубачкам гарбаты. Калі перамовы праходзілі паспяхова, госці атрымлівалі процідзідзе.

Размаўляюць двое:

— Што б ты хацеў мець — пяць тысяч долараў ці пяць дачок?

— Пяць дачок.

— Чаму?!

— Таму, што зараз іх у мяне восем...

Аб'ява: вадзіцель машыны ВАЗ 2109 з літарай «Л» на багажніку, вярніце літару вадзіцелю аўтамабіля EXUS!

— Як называецца мужчына, які яўна ставіцца з пагардай або нават ненавісцю жанчын і пасадысцку робіць усё магчымае, каб зрабіць іх пасмешышчам?

— Вялікі куцюр'е.

Дзве жанчыны размаўляюць:

— Твой на працу ходзіць?

— Так.

— Правільна! Я таксама свайму на праезд не даю.

Здымаецца кіно

ХАННА І БУРАЎ

Зоркі сусветнага экрана сумеснымі намаганнямі ствараюць новае беларускае кіно. Пад Мінскам пачаліся здымкі маштабнага ваенна-прыгодніцкага мастацкага фільма «Чэрвень».

...На пыльнай палутарцы савецкі пагранічнік Бураў урываецца ў мірнае жыццё згубленага дзесьці на заходніх рубяжах СССР беларускага паўстанка. Дзяўчына-полька Ханна Бельская адшуквае Бурава ў натоўпе. Погляд яе ўстрывожаны. Здаецца, Ханна вось-вось кінецца да лейтэнанта, пяшчотна абдыме яго і раскажа свайму суджанаму аб тым, як яна чакала яго ўсе гэтыя дні разлукі, як яна кахае яго. Але Ханна не ў сілах зрабіць ні кроку насустрач свайму каханню. Яна ведае: савецкім пагранічнікам пад страхам хуткай расправы НКУС забараняе сустракацца з мясцовымі дзяўчатамі. Закаханыя павінны бачыцца толькі тайна. Бураў таксама памятае аб забароне і таму з усіх сіл стараецца не заўважыць каханую — дзяўчыну ў лёгкай белай сукенцы, такую чыстую і светлую, быццам саткануую з промняў спякотнага чэрвеньскага сонца. Ён ідзе паўз гандлёвыя рады, усміхаючыся прывітальным гандлярам, упэўненым жэстам папраўляючы гімнасцёрку — зацягнуты партупеяй лейтэнант-пагранічнік Іван Бураў. Герой Халхін-Гола, выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі, які верыць у непераможнасць Чырвонай Арміі...

Ён яшчэ не ведае, што заўтра ўсё зменіцца. Не будзе гэтага міру, паўстанка, гэтых прывітальных беларусаў, палякаў, цыганоў... І каханне Бурава і Ханны, якое пробіваецца да шчасця насуперак усім перашкодам, ледзьве не загіне ў акіяне нянавісці і варожасці.

...Голас рэжысёра Аляксандра Франскевіча-Лайе вяртае мяне да рэчаіснасці.

— Стоп! Знята! — крычыць рэжысёр. І плошча ля паўстанка ператвараецца ў здымачную пляцоўку новага мастацкага фільма «Чэрвень». Сімпатычныя вяскоўцы аказваюцца статыстамі з масоўкі, а бравы лейтэнант Бураў — заслужаным артыстам Расійскай Федэрацыі Сяргеем Бязрукавым. Тым самым... Лаўрэатам незлічоных прэмій расійскіх і міжнародных фестываляў, акцёрам, які стварыў вобразы галоўных герояў культавых фільмаў «Брыгада», «Участак», «Ясенін», «Майстар і Маргарыта».

Роля лейтэнанта Івана Бурава ў гэтым шэрагу паспяховых акцёрскіх работ Сяргея Бязрукава, паводле прызнання яго самога, займае асаблівае месца. Гэта першая спроба асабіста спасцігнуць той вопыт і пачуцці, якія ў поўнай меры адчулі ветэраны Вялікай Айчыннай, што ўратавалі свет ад карычневай чумы.

— 9 мая мы заўсёды віншавалі майго дзеда, — успамінае Сяргей Бязрукаў. — Дзед ваяваў у мотаразведцы, пайшоў на фронт у семнаццаць гадоў. Быў кантужаны, цяжка паранены. У Дзень Перамогі мы ўсёй сям'ёй выходзілі на Красную плошчу. Абавязкова з букетам нарцысаў. Я, падлетак, уручаў букет першаму ветэрану, якога мы сустракалі. Заўсёды памятаю, у якім мы даўгу перад салдатамі, што перамаглі фашызм. І гэты фільм мы ствараем у памяць аб іх подзвігу. Лічу, што вельмі важна памятаць аб той далёкай вайне. І гэта не гучныя словы.

Маладая польская актрыса Магдалена Гурска таксама ўпершыню звяртаецца ў сваёй творчасці да гэтай тэмы.

— У Польшчы цяпер амаль не здымаюць фільмаў аб барацьбе супраць гітлерызму, — гаворыць Магдалена. — Але нашы людзі хочуць даведацца больш і пра герояў Варшаўскага паўстання, і пра салдат, якія вызвалялі Польшчу ад ворагаў. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца старыя польскія фільмы пра вайну. Хацелася б, каб наш «Чэрвень» убачылі не толькі расійскія, беларускія, але і польскія гледачы.

Паводле задумы прадзюсара Глеба Шпрыгава, які адначасова з'яўляецца і сааўтарам сцэнарыя фільма, на долю герояў фільма выпадае мноства самых цяжкіх нявзгод. Аб самай страшнай вайне фільм расказвае без перабольшанняў.

Адзін за другім гінуць на граніцы баявыя сябры Івана. Бураў аказваецца перад нялёгкім маральным выбарам — скарыцца ці працягваць супраціўленне фашызму ў адзіночку. І вырашае змагацца з ворагам нягледзячы на тое, што сіл і сродкаў да барацьбы ў яго няма амаль ніякіх. Маральнай асновай яго барацьбы становіцца каханне да Ханны Бельскай. Сапраўднае пачуццё дапамагае Бураву выстаяць...

Сюжэт чатырохсерыйнага тэлевізійнага мастацкага фільма «Чэрвень» заснаваны на аповесці А. Смірнова «Чэрвень». Аднак сцэнарысты Сяргей Ашкеназі і Глеб Шпрыгаў (аўтар сцэнарыяў і прадзюсар рэйтынгавых тэлесерыялаў «На безыменнай вышыні» — фільм-намінант прэміі Расійскай тэлеакадэміі ТЭФІ-2002, «Чалавек вайны», «Апошні браняпоезд», «Маёр Ветраў») не абмежаваліся скупой сюжэтнай лініяй літаратурнай першаасновы. Пад іх пяром рэалістычны расказ савецкага пісьменніка ператвараецца ў рамантызаваную гісторыю, у якой пачуцці, імкненні, матывы ўчынкаў герояў і іх антыподаў даведзены да крайняй ступені эмацыянальнай выразнасці.

Рэжысёр-пастаноўшчык кінакарціны Аляксандр Франскевіч-Лайе (серыялы «Сляпы-2», «Маёр Ветраў») мяркуе, што такое імкненне сцэнарыстаў сугучнае з яго аўтарскім бачаннем матэрыялу.

— Мы створым фільм страсны і магутны, яркі і бязмежна жорсткі ў сваёй праўдзівасці, здольны па-новаму адлюстраваць на тэлеэкране тэму Вялікай Айчыннай вайны, — адзначае Аляксандр Франскевіч-Лайе.

У фільме «Чэрвень» нямала складаных «экшэн»-сцэн. На працягу бясконцых дубляў Сяргею Бязрукаву давялося скакаць у рэчку, цягаць цяжкія бярвенні і ўзбірацца на пясчаныя абрывы. І нават спаборнічаць у бегу з... паравозам. Польскаму акцёру Паўлу Дэлонгу, выканаўцу ролі капітана вермахта Отта Рэгнера (раней Павел зняўся ў блокбастэрах «Спіс Шындлера», «Quo vadis», многіх іншых вядомых еўрапейскіх і амерыканскіх кінафільмах) разам з вядомым беларускім акцёрам і прадзюсарам Уладзімірам Янкоўскім давялося адважна пераадольваць балотную багну і бураломы пад Смалявічамі, рэпеціруючы сцэны пагоні. Маладому маскоўскаму акцёру Міхаілу Калінічаву, які выконвае ролю пагранічніка-беларуса Карпенюка, давялося ў рэкордна кароткія тэрміны вывучыць беларускую мову і авалодаць тонкасцямі язды на цяжкім ваенным матацыкле ўзору 1941 года.

Здымачны перыяд фільма «Чэрвень» прадоўжыцца да сярэдзіны жніўня. Ствараецца праект па заказу ЗАТ «Цэнтрал Партнершып» расійскай вытворчай кампаніяй «М2Ф» і беларускай кампаніяй «Белпартнёр ТВ» пры падтрымцы Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». У здымках кінакарціны прымаюць удзел падраздзяленні беларускай арміі і МУС.

У праграмах вядучых тэлеканалаў Расіі і Беларусі мастацкі тэлефільм «Чэрвень» можа з'явіцца ўжо вясной 2008 года. Стваральнікі новага расійска-беларуска-польскага ваенна-прыгодніцкага серыяла ўпэўнены, што іх праект будзе мець поспех у гледачоў трох краін.

Ганна КАСЦЮЧЭНКА.
Фота аўтара.

Сяргей БЯЗРУКАЎ у ролі лейтэнанта Івана БУРАВА.

Польская актрыса Магдалена ГУРСКА — выканаўца ролі галоўнай гераіні серыяла «Чэрвень».



Рэжысёр-пастаноўшчык Аляксандр ФРАНСКЕВІЧ-ЛАЙЕ і Сяргей БЯЗРУКАЎ абмяркоўваюць чарговую мізансцэну фільма.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.40	21.45	17.05
Віцебск —	4.21	21.44	17.23
Магілёў —	4.30	21.36	17.06
Гомель —	4.36	21.23	16.47
Гродна —	4.57	21.59	17.02
Брэст —	5.07	21.50	16.43

Імяніны

Пр. *Амоса, Іоны, Касьяна, Лазара, Рыгора, Фёдара;*
К. *Вольгі, Раісы, Вінцэнта, Ірынэя, Лявона, Паўла.*

Месяц

Поўня 30 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Стральца.

Па звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 28.06.2007

Экстрэмальны ..... 11+
Вельмі высокі ..... 8—10
Высокі ..... 6—7
Умераны ..... 3—5
Нізкі ..... 1—2

Для бязвоблачнага неба: UV INDEX 66

З улікам прагназуемай воблачнасці: UV INDEX 59

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **15 хвілін**.

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+16 — +18 °C	МАСКВА	+20 — +22 °C
ВІЛЬНЮС	+18 — +20°C	РЫГА	+13 — +15 °C
КІЕЎ	+19 — +21 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+14 — +16 °C

Без ападкаў

28 чэрвеня

Дзве даты

1942 год — 65 гадоў таму не стала Янкі Купалы, народнага паэта Беларусі, драматурга, публіцыста, грамадскага дзеяча.

1914 год — у Сараеве забіты аўстра-венгерскі эрцгерцаг Франц Фердынанд, што і прывяло да пачатку Першай сусветнай вайны. Дарэчы, дакладна у гэты ж дзень **у 1919 годзе** ў Версалі падпісаны мірны дагавор дзяржавамі-пераможцамі (ЗША, Брытанскай імперыяй, Францыяй, Італіяй, Бельгіяй і іншымі) з аднаго боку і пераможанай Германіяй — з другога, які завяршыў Першую сусветную вайну.

Цытата дня:

Самае вялікае, што я магу зрабіць для свайго сябра,— проста быць яму сябрам».

Генры Таро (1817—1862), амерыканскі пісьменнік.

СТАНЦЫЙНЫ КАРУПЦЫЯНЕР

Да 4 гадоў пазбаўлення волі асуджаны колішні начальнік станцыі рамонту і тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў Міністэрства абароны Беларусі.

Паводле звестак прэс-службы ўпраўлення КДБ па Мінску і сталічнай вобласці, станцыйны карупцыянер у перыяд са снежня 2005 па верасень 2006 года за хабар здаваў у арэнду вольныя плошчы, якія меліся на падначаленым прадпрыемстве. Нядобрасумленную службовую асобу чэкісты злавілі за руку ў момант атрымання чарговай «траншы» хабару ў памеры 700 долараў. А ўсяго начальнік станцыі зарабіў «карупцыйным спосабам» 3500 «зялёных».

Апроч таго, падчас вобыску ў хабарніка былі знойдзены 178 пісталетных патронаў. За незаконнае захоўванне боепрыпасаў таксама была ўзбуджана крымінальная справа і давялося несці адказнасць.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Паважаная **Вера Раманаўна КАЗАК** з в. Галынь! Віншуем з юбілеем.

Пажадаць мы хочам самага зямнога — доўгіх год, здароўя, цеплаты.

Супрацоўнікі.

Шчыра віншуем дарагіх бацькоў **Валянціну Віктараўну і Уладзіміра Аляксандравіча МАЛІШЭЎСКІХ** з 30-годдзем сумеснага жыцця. Жадаем моцнага здароўя, поспехаў у працы, шчасця і радасці ў далейшым сумесным жыцці.

Дзеці, зяці, унукі.

36,6°

ПЕРАМОЖАМ СТРЭС — НЕ ЗГАРЫМ НА РАБОЦЕ

Кіраўнікі прадпрыемстваў і кампаній занепакоены ў першую чаргу прыбыткам і павышэннем рэнтабельнасці, але мала хто з іх звяртае пры гэтым увагу на прафесійнае выгаранне супрацоўнікаў. Праблема яшчэ і ў тым, што сам калектыў мала што ведае пра гэта.

Сіндром прафесійнага выгарання, які развіваецца на фоне хранічнага стрэсу, небяспечны тым, што спустошвае эмацыянальна-энергетычныя рэсурсы чалавека. Памянёны сіндром узнікае ў выніку назапашвання адмоўных эмоцый і адсутнасці адпаведнай «разрадкі». Чалавек, які пачаў выгараць, рызыкуе «згарэць датла». Але ўсё па парадку. Стрэс, як вядома, — гэта напружанне, якое ўзнікае ў адказ на розныя экстрэмальныя ўздзеянні. Поўнасцю пазбегнуць стрэсаў немагчыма, але можна навучыцца кіраваць стрэсавымі сітуацыямі.

Паводле слоў **урача-валеолага 17-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Інэсы ПАЛАЗНІК**, фізічна стрэс праяўляецца хранічнай стомленасцю, слабасцю, парушэннем сну, халоднымі канечнасцямі, павышанай патлівасцю або сухасцю скураных покрываў, алергічнымі рэакцыямі, схільнасцю да частых прастудных захворванняў, зменамі апетыту, устойлівымі парушэннямі артэрыяльнага ціску і сардэчнага рытму. Эмацыянальныя прыкметы праяўляюцца неспакоем, зніжаным агульным фонам настрою, схільнасцю да частых слёз, апатыі, павышанай стомленасцю, пачуццём страты кантролю над сабой і сітуацыяй, абыякавасцю да навакольных і свайго лёсу, павышанай узбуджальнасцю, з'яўленнем пачуцця бездапаможнасці, агрэсіўнасцю, пачуццём панікі, нервознасці па самых нязначных прычынах.

Нягледзячы на тое, што стрэс звычайна праяўляецца знешне, няроўдка бывае цяжка вызначыць наяўнасць стрэсавага стану, паколькі ў некаторых людзей напружанне можа быць не выражаным. Таму аценіць стрэс дапамагаюць розныя тэсты. З дапамогай наступнай шкалы можна ацаніць агульны стан арганізма. Лепей выбіраць тыя значэнні, якія адпавядаюць вашаму стану на працягу апошніх 4—5 дзён. Вазьміце за аснову наступную шкалу балаў:

ніколі — 1 бал, надзвычай рэдка — 2 балы, вельмі рэдка — 3 балы, рэдка — 4 балы, часам — 5 балаў, часта — 6 балаў, вельмі часта — 7 балаў, пастаянна — 8 балаў. Аценіце кожнае з наступных сцвярджэнняў па гэтай шкале.

Я напружаны і ўсхваляваны (узбуджаны).

У мяне камяк у горле і (або) я адчуваю сухасць у роце.

Я перагружаны работай. Мне зусім не хапае часу.

Я праглынаю ежу або забываю паесці.

Я абдумваю свае ідэі зноў і зноў, я мяняю свае планы, мае думкі пастаянна паўтараюцца.

Я адчуваю сябе адзінокім, ізаляваным і незразуметым.

Я пакутую ад фізічнага недамагання: баліць галава, напружаны мышцы шыі, болі ў спіне, спазмы ў страўніку.

Я захоплены думкамі, змучаны або занепакоены.

Мяне раптоўна кідае то ў гарачку, то ў холад.

Я забываю на сустрэчы ці справы, якія павінен зрабіць ці вырашыць.

Я лёгка магу заплакаць.

Я адчуваю сябе стомленым.

Я моцна сціскаю зубы.

Я спакойны.

Мне цяжка дыхаць і (або) у мяне раптоўна перахоплівае дыханне.

Я маю праблемы са стараваннем, кішачнікам.

Я ўсхваляваны, занепакоены, засаромлены.

Я лёгка палохаюся, шум ці шорах прымушаюць мяне ўздрыгваць.

Мне неабходна больш чым паўгадзіны, каб заснуць.

Я збіты з толку, мае думкі заблытаныя, мне не хапае засяроджанасці, я не магу сканцэнтраваць увагу.

У мяне стомлены выгляд, мяшкі або кругі пад вачыма.

Я адчуваю цяжар на сваіх плячах.

Я ўстрывожаны. Мне неабходна пастаянна рухацца, я не магу ўстаяць на адным месцы.

Мне цяжка кантраляваць свае ўчынкі, эмоцыі, настрой, жэсты.

Я напружаны.

Падлічыце балы. Чым вышэй акажацца сумарны паказчык, тым вышэй будзе ўзровень стрэсу.

Меней за 99 балаў — нізкі ўзровень стрэсу.

100—125 балаў — сярэдні ўзровень.

Болей за 125 балаў — высокі ўзровень.

Калі мы гаворым пра стрэс, неабходна звяртаць увагу і на тып асобы.

Так, **слабалюбівы тып** мае патрэбу ў дасягненні поспеху, арыентуецца на станоўчы вынік. Гэтыя людзі энергічныя, рухавыя, агрэсіўныя, скіраваныя на справу. Прычыны стрэсу для іх хаваюцца ў перагрузках, вялікай інтэнсіўнасці дзейнасці, міжасобасных адносінах, недастатковым разуменні сябе. Асноўныя сімптомы стрэсу: бяссонніца, высокі ціск, курэнне і злоўжыванне алкаголем.

Спакойны тып — гэта людзі малаактыўныя, любяць марыць, арыентуюцца на мінулае. Добра вытрымліваюць баланс паміж работай і домам, валодаюць нізкай узрушальнасцю да стрэсу. Прычынамі для ўзнікнення стрэсавай сітуацыі для іх могуць служыць іншыя людзі або прафесійныя патрабаванні, здольныя парушыць або ўнесці хаос у стабільнае цячэнне іх жыцця.

Сумленны тып. Людзі дробязныя, педантычныя, датошныя, дагматычныя і стабільныя, абавязковыя. Вытрымліваюць традыцыі, выконваюць усе неабходныя фармальнасці і прадпісанні. Вераць прызнаным аўтарытэтам. Прычыны стрэсу ў дадзеным выпадку хаваюцца ў людзях, якія разбураюць стэрэатыпы паводзінаў і парушаюць стабільнасць. Ступень уразлівасці да стрэсаў для такіх людзей характэрна сярэдняя, хоць яны вельмі адчувальныя да самых дробных змен іх звыклай жыццядзейнасці.

Тып, які не адстойвае. Такія людзі не могуць ні пастаяць за сябе, ні адстаяць свае правы і дасягненні. Яны баяцца канфліктаў і канфрантацыі, таму імкнуцца пазбягаць абвастрэнняў у працэсе камунікацыі, імкнуцца дагадзіць. Прычыны стрэсу — у пастаянным унутраным напружанні, якое ўзнікае на падставе складаных камунікацый з іншымі людзьмі.

Жыццелюбівы тып. Моцныя, энергічныя людзі, якія жывуць паўнацэнным жыццём, прагнуць новых уражанняў і падзей. Імпульсіўныя і схільныя да рызыкі, частай змены інтарэсаў. Прычыны стрэсу — у руціне, сумнай, манатоннай рабоце, празмерным унутраным напружанні.

Трывожны тып. Гэтыя людзі валодаюць высокай уразлівасцю да стрэсу, паколькі пастаянна хвалююцца і непакояцца па прычыне магчымых негатыўных сітуацый, жывуць чаканнем магчымых няўдач і страт. Характэрна спалучэнне высокага ўнутранага напружання з нізкай самаацэнкай. Прычыны стрэсу для такіх людзей — сітуацыі, якія вымушаюць прыняць на сябе адказнасць, рэзкія змены ў жыцці.

Сімптомы сіндрому выгарання, як і рэакцыя на стрэсавыя сітуацыі, у розных людзей — розныя. Гэта можа быць, напрыклад, адсутнасць цікаўнасці да навізны ці рэакцыі страху на небяспечную сітуацыю, можа быць слабасць, галаўныя болі, расстройства страўнікава-кішачнага тракта, змены масы цела, поўныя або хастковая бяссонніца, пачуццё занепакоенасці і павышанай трывожнасці, агульная негатыўная ўстаноўка на жыццёвыя і прафесійныя перспектывы, аддаленасць ад супрацоўнікаў і кліентаў...

Раіць Інэса Палазнік: *Вызначайце кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя мэты; бярыце тайм-аўты — адпачывайце ад работы; валодайце навыкамі самарэгуляцыі — станоўчая ўнутраная гутарка спрыяе зніжэнню ўзроўню стрэсу; забяспечце сабе прафесійнае развіццё і самаўдасканаленне — наведвайце курсы павышэння кваліфікацыі, канферэнцыі і г.д.; пазбягайце непатрэбнай канкурэнцыі — празмернае імкненне да выйгрышу нараджае трывогу, павышае агрэсіўнасць; кантактуйце з іншымі людзьмі — аналіз пачуццяў і спроба падзяліцца імі знікае верагоднасць эмацыянальнага выгарання; падтрымлівайце добрую фізічную форму — няправільнае харчаванне, злоўжыванне спіртнымі напоямі, курэнне, рэзкія змены масы цела ўзмацняюць працэсы выгарання. З мэтай прафілактыкі раю таксама размяркоўваць свае нагрузкі, пераключацца з аднаго віду дзейнасці на іншы, працаваць ставіцца да канфліктаў на рабоце, не спрабаваць быць лепшым заўсёды і ва ўсім.*

Святлана БАРЫСЕНКА.

Інфарм-укол

БЯЛОК ДЛЯ ПРЫГОЖЫХ ВАЛАСОЎ

Пратэін неабходны нашым валасам не менш, чым нашым мышцам. Бялок бярэ ўдзел у фарміраванні асноўнай будаўнічай адзінкі валаса — кераціну. З-за недахопу пратэіну ў рацыёне валасы становяцца тонкімі і ломкімі.

Шампуні ж аказваюць уздзеянне на волас ужо пасля таго, як ён поўнасцю сфарміраваўся, і не могуць выправіць дэфекты яго развіцця. Таму правільнае харчаванне — галоўная ўмова здаровых валасоў. Рэкамендуецца ўключаць у рацыён розныя крыніцы бялку: адвараныя мяса, арэхі, сою, пры гэтым энергетычная каштоўнасць штодзённага меню павінна быць не менш за 1700 ккал.

ПОЎНЫМ НЕ СТАЕ ВАДЫ

Для падтрымання абмену рэчываў на належным узроўні, захавання светлага розуму і добрай фізічнай формы, арганізму патрэбна бесперабойнае водазабеспячэнне.

Сярэдняя норма — 8 шклянак вадкасці невялікімі порцыямі на працягу дня. У спёку і холад, калі павялічваецца выпарванне вільгаці падчас дыхання, у час трэніровак, авіявандровак, пры павышанай тэмпературы цела, стрэсе, у крытычныя дні і ў іншых неспрыяльных сітуацыях патрэба ў жыватворнай вільгаці рэзка ўзрастае. Піць варта задоўга да моцнай смагі, паколькі апошняя сведчыць ужо аб абязводжванні арганізма, дапускаць якое нельга ні ў якім разе. Калі мы прымушаем арганізм таміцца ад смагі, то парушаем абмен рэчываў, у выніку чаго ў падскуранай клятчатцы адкладваецца лішак тлушчу. Вада патрэбна для таго, каб «вымываць» таксічныя рэчывы і прадукты згарання тлушчу з-пад скуры.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287-19-19 (тэл/факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.341. Індэкс 63850. Зак. № 3490. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12